Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 23 1933 г. НЯДЗЕЛЯ № 160 (4704) Год выданьня XVI

Пасяджэньне пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б з партактывам

23-га ліпеня а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дому Камасьветы (вул. Карла Маркса) адбудзецца пасяджэньне VII-га аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК разам з чыгуначным, цэнтральным і гарадзкім партактывам.

НА ПАВЕСТЦЫ ДНЯ:

РАШЭНЬНЕ ЦК УсеКП(б) АБ ПЕРАБУДОВЕ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ (дакл. т. т. ГАЛАДЗЕД, ІВАНОЎ).

Члены і кандыдаты ЦК, ЦКК, Менгаркому КП(б)Б, сакратары райкомаў КП(б)Б, старшыні РКК-РСІ і начальнікі палітаддзелаў МТС і саўгасаў праходзяць па сваіх мандатах.

Парткалектывы атрымоўваюць білеты ў Менгаркоме КП(б)Б (аргаддзел).

ЦК і ЦКК КП(б)Б.

1-га жніўня адзначым усебеларускім чырвоным абозам са збожжам

АРГАНІЗАВАЦЬ БЕСЬПЕРАБОЙНЫ ЗБОЖЖАВЫ КАНВЭЕР АД МАЛАТАРНІ ДА ЭЛЕВАТАРА І ПРЫЁМАЧНАГА ПУНКТУ

ХТО БУДЗЕ ПЕРШЫМ

УБОРКА ПАЧАЛАСЯ.

Перадавыя калгасы выходзяць жаць. У калгасах Ветрынскай МТС разгортваецца церабленьне звышраньняга ільну. На палёх гэтых калгасаў запрацавалі ільнацерабілкі, якія ўжо выцерабілі першыя гэктары ільняных масываў.

Заклік зьезду калгасьнікаў-ударнікаў арганізаваць усебеларускі чырвоны абоз са збожжам новага ўраджаю знаходзіць гарачы водгук у калгасных масах.

Прачытайце тэлеграмы з месц.

СЯННО: калгасы «Перамога», Завер'е, Ульянавічы і «Чырвоны мэталіст» абавязаліся здаць збожжа з ураджаю азімых да 1-га жніўня. Жніво разгарнулася з 20 ліпеня.

ЕЛЬСК: у калгасах «Праца» і «Чырвоная зара» пачалася ўборка ячменю і жыта. Збожжа з першага абмалоту калгасьнікі здаюць дзяржаве чырвоным абозам.

ХОЙНІКІ: калгасы «Чырвоны араты» і «Чырвоны гай» арганізавалі першы ў рэспубліцы чырвоны абоз з ячменем новага ўраджаю. Дзяржаве здана звыш 1 тоны збожжа ў лік цьвёрдых паставак с.-г. прадуктаў.

Узначаліць гэты ўздым мас, разгарнуць сапраўднае спаборніцтва раёнаў, МТС, калгасаў і працоўных аднаасобнікаў нашай рэспублікі на хутчэйшую і лепшую ўборку і датэрміновае правядзеньне збожжапаставак—вось у чым задача задач.

У нашых руках багацейшыя магчымасьці для хутчэйшай уборкі і паставак збожжа, бульбы і загатоўкі ільну.

Мы ўжо не гаворым аб добрых кліматычных умовах для ўборкі, а яны ў гэтым годзе выключныя.

Тэхнічная база нашых калгасаў значна вырасла. У нашым распараджэньні —буйныя складаныя машыны: малатарні, ільнацерабілкі на трактарнай і коннай цязе і г. д.

Партыя разграміла контр-рэвалюцыйную легенду недабітага нацдэмаўска-прышчэпаўскага ахвосьця аб тым, што «па нашых беларускіх палёх машыны ня пойдуць».

Ламаючы навеяныя клясавым ворагам антымэханізатарскія настроі, партыя зрабіла гігантскі крок наперад па шляху далейшай мэханізацыі ўборачных работ. Упяршыню ва ўсёй гісторыі нашай краіны ў БССР будуць працаваць камбайны. Яны ўжо завозяцца і хутка ўбяруць першыя гэктары збожжавых на саўгасных палёх Церахаўскага раёну.

А што значыць той карэнны пералом сьвядомасьці калгасных мас у іх адносінах да калгаснай працы, які ярка прадэманстравала сабою першая бальшавіцкая сяўба другой сацыялістычнай пяцігодкі.

Ён азначае канчатковую перамогу калгаснай справы, новы магутны рост гаспадарча-палітычнай актыўнасьці калгасных мас, іх адданасьці ленінскай партыі.

Лёзунг тав. СТАЛІНА аб заможным калгасным жыцьці і новы закон аб збожжапаставках выклікалі ў калгасьніках сур'ёзную зацікаўленасьць у выніках калгаснай працы, у якасьці калгаснай вытворчасьці.

А ўсё гэта ў цэлым—вагары (і вагары найвялікшай сілы) хутчэйшага і бяз страт правядзеньня ўборкі, хутчэйшага правядзеньня паставак с.-г. прадуктаў нашай пралетарскай дзяржаве.

Калгасны лад у корані зьмяняе погляды працоўнага селяніна на сельскагаспадарчую працу.

Капіталізм асуджаў селяніна на «ідыётызм вясковага жыцьця», на кулацкую кабалу і эксплёатацыю. Воўчы закон капіталістычнай канкурэнцыі, кулацкая кабала рабілі працу для асноўных мас сялянства адвечным ярмом, нязносным цяжарам.

Калгасны лад ператварае працу ў справу, якая адкрывае перад селянінам шлях да заможнага калгаснага жыцьця, якая нараджае таварыскую ўзаемадапамогу, каб разам, агульнымі аб'яднанымі сіламі дабіцца агульнага ўздыму, пабудаваць новае і заможнае калгаснае жыцьцё.

І самі калгасныя масы ўжо вылучылі са сваіх радоў тысячы такіх работнікаў, тысячы такіх ударнікаў калектыўнай сацыялістычнай працы, якіх раней мы мелі толькі на нашых заводах і фабрыках.

Аднак, толькі палітычны сьляпец, закасьцянелы чынуша, махровы апартуніст могуць думаць, што гэта справа пойдзе сама сабой, самацёкам.

Тав. Сталін ня раз падкрэсьліваў, што сьвядомасьць, псыхалёгія людзей на пэўны пэрыяд адстаюць ад іх фактычнага становішча. Селянін у калгасе, будучы калектывістам па сваім становішчы, па сваіх адносінах да сродкаў вытворчасьці, яшчэ захоўвае ў сабе перажыткі дробна-ўласьніцкай індывідуалістычнай псыхалёгіі, перажыткі пакінутыя ў спадчыну адвечнымі традыцыямі старога ўкладу гаспадаркі—раздробленай аднаасобнай гаспадаркі—гэтай жыцьцёвай крыніцы капіталізму.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ТРЭБА АРГАНІЗАВАЦЬ.

Творчы ўздым мас, які азнаменавала сабою веснавая сяўба, павінен быць замацован, узьнят на новую вышэйшую ступень, ператворан у рухавік пасьпяховай арганізацыі ўборкі і збожжапаставак.

Другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў прадоўжыў сацыялістычны дагавор з Заходняй вобласьцю і абвясьціў усебеларускае спаборніцтва калгасаў і працоўных аднаасобнікаў.

Гэта—частка тэй гістарычнай справы, імя якой усесаюзнае спаборніцтва рэспублік, абласьцей, краёў, раёнаў за пяршынства ва ўборцы і пастаўках збожжа, у пасьпяховым завяршэньні першага сельска-гаспадарчага году другой пяцігодкі.

Якая ганаровая вялікая задача для кожнай партыйнай арганізацыі, для кожнага камуніста і калгасьніка-ўдарніка!

Спаборніцтва—гэта ня значыць толькі падпісаць дагавор, ухваліць прыгожую адозву, надаваць гору абяцаньняў і супакоіцца. Супроць такога бюракратычнага апашленьня ленінскай ідэі спаборніцтва трэба змагацца, выкрываць алілюйшчыну і славесную дэклярацыйнасьць.

Якасьць спаборніцтва правяраецца на палёх у барацьбе за хутчэйшую ўборку і пастаўкі с.-г. прадуктаў дзяржаве.

Задача заключаецца ў тым, каб максымальна скараціць тэрміны ўборачных работ, каб захаваць кожны колас, кожную бульбінку ад пасяганьняў клясавага ворага.

Густая і высокая азіміна, буйная налітая ярына на калгасных палёх выклікаюць шалёную злосьць у недабітых рэштак клясава-варожых элемэнтаў. Ужо зьявіліся кулацкія «парыкмахэры», якія зразаюць каласы, якія імкнуцца раскрасьці калгасны ўраджай.

Сапраўдны калгасьнік-ударнік перш за ўсіх і раней за ўсіх павінен хварэць душой за калгасны ўраджай, берагчы іх, як уласнае вока, выкрываць малейшую спробу кулацкага ахвосьця раскрасьці недатыкальную грамадзкую маемасьць.

Трэба ўзьняць пільнасьць мас супроць раскрадвальнікаў калгаснай маемасьці, як ворагаў народу, трэба арганізаваць сапраўднае спаборніцтва паміж калгасамі і паасобнымі калгасьнікамі, паасобнымі брыгадамі на лепшую ахову ўраджаю.

Мала будзе, калі брыгада толькі ў тэрмін убярэ ўраджай на сваім вытворчым вучастку. Просты абавязак, кроўная СПРАВА БРЫГАДЫ І КОЖНАГА КАЛГАСЬНІКА — ДАБІЦЦА, КАБ НІ АДЗІН КОЛАС НЕ ЗАГІНУЎ МАРНА, КАБ УСЁ ЎБРАЦЬ БЯЗ СТРАТ, КАБ ЗАХАВАЦЬ КАЛГАСНАЕ ДАБРО АД ПРОШУКАЎ КЛЯСАВАГА ВОРАГА.

Задача заключаецца ў тым, каб не зацягваць, а своечасова разгарнуць і рашуча ФАРСАВАЦЬ АБМАЛОТ З ТЫМ, КАБ ЗБОЖЖА З ПЕРШАГА АБМАЛОТУ ЗДАЦЬ ДЗЯРЖАВЕ ПА ЦЬВЁРДЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАХ.

«ЗЬВЯЗДА» ў адказ на заклік ЦО «ПРАВДЫ» арганізуе ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ ЎДАРНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА.

На дошку будуць заносіцца тыя раёны, тыя МТС і калгасы, тыя сельсаветы, якія першымі і да тэрміну бяз страт убяруць ураджай, якія першымі і да тэрміну выканаюць свае абавязацельствы перад пралетарскай дзяржавай—здадуць дзяржаве с.-г. прадукты самай высокай якасьці, якія яны павінны здаць па цьвёрдых пастаўках.

ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, мабілізуйце масы, накіруйце творчую актыўнасьць калгасьнікаў, дабівайцеся, каб кожны калгас, кожны сельсавет змагаліся за права быць першымі ЗАНЕСЕНЫМІ НА ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ!

КАЛГАСЬНІКІ-ЎДАРНІКІ! Апраўдайце ўскладзенае на вас высокае давер'е, дамагайцеся, каб вашы калгасы ўдарнай уборкай і бальшавіцкім правядзеньнем збожжапаставак заваявалі права быць у ліку перадавікоў на чырвонай дошцы, дасылайце свае ўклады ва ўсебеларускі першажніўвеньскі абоз са збожжам новага ўраджаю.

ДАБ'ЕМСЯ, каб наша рэспубліка заняла пачэснае месца ва ўсесаюзным спаборніцтве за пяршынства ва ўборцы і пастаўках збожжа, бульбы і ільну!

ДАБ'ЕМСЯ, каб з гонарам апраўдаць абавязацельствы, узятыя другім зьездам калгасьнікаў-ударнікаў, і заваяваць пяршынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю!

ДАБ'ЕМСЯ, каб наша рэспубліка ў ліку перадавых была занесена на ўсесаюзную чырвоную дошку!

23 ліпеня

Кожны дзень прыносіць новыя весткі з перадавых калгасаў і вёсак аб пачатку ўборачных работ. Многія калгасы ўжо прыступілі да абмалоту новага ўраджаю. Мы напярэдадні масавага разгортваньня ўборкі па ўсёй рэспубліцы.

Таму зусім зразумела, што на мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі зараз як ніколі кладзецца вялікая адказнасьць па падрыхтоўцы і арганізацыі здачы збожжа дзяржаве, па правядзеньні новага закону аб цьвёрдых пастаўках.

Аднак, ужо зараз прыходзіцца канстатаваць, што ў радзе месц назіраецца яўная недаацэнка важнасьці збожжазагатовак бягучага году, незразуменьне новых абставін у сувязі з законам аб цьвёрдых пастаўках.

Вось для прыкладу ЛЕПЕЛЬСКІ раён, аб якім мы сёньня зьмяшчаем матар'ял. Тут збожжазагатоўчую кампанію сустракаюць зусім непадрыхтаванымі. ДА ГЭТАГА ЧАСУ РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЯ ЗДОЛЕЛІ НАВАТ ПАКОНЧЫЦЬ З УРУЧЭНЬНЕМ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПА ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ. Масавая работа сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў ігнаруецца. Тэхбаза Загатзбожжа не падрыхтавана. Дагэтуль гатовы да прыёмкі збожжа толькі адзін склад.

Амаль такі-ж малюнак і ў ПОЛАЦКІМ раёне. Тут райкантора Загатзбожжа таксама не сьпяшаецца. Склады не падрыхтаваны, прыёмачныя пункты не адрамантаваны і не прыстасаваны да работы.

У ЦЕРАХАЎСКІМ раёне няма належнай колькасьці тары для прыёмкі збожжа. Замест 2 тыс. мяшкоў ёсьць толькі 490.

ТАКОЕ СТАНОВІШЧА НАДАЛЕЙ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЦЯРПІМА. Неабходна зараз-жа мабілізаваць усе сілы і сродкі на своечасовую падрыхтоўку і арганізацыю збожжазагатовак.

Партыйныя і савецкія арганізацыі БССР абавязаны разгарнуць шырокую масавую работу, цесна ўвязаць задачы ўборкі ўраджаю з выкананьнем цьвёрдых паставак.

ПЕРШАГА ЖНІЎНЯ—ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЧЫРВОНЫ АБОЗ ПА ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ. Гэты дзень зьявіцца фактычна першым экзаменам для ўсіх раённых арганізацый. Па якасьці падрыхтоўкі і правядзеньня ўсебеларускага чырвонага абозу можна будзе судзіць аб гатоўнасьці тэй ці іншай арганізацыі да далейшага правядзеньня загатоўчай кампаніі. Гэта павінны памятаць усе партыйныя і савецкія арганізацыі, усе парт'ячэйкі, сельсаветы і калгасы.

Чырвоныя абозы са збожжам першага абмалоту

ХОЙНІКІ, 21. Калгасьнікі с.-г. арцеляў «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ» і «ЧЫРВОНЫ ГАЙ», улічваючы палітычную важнасьць датэрміновай здачы збожжа дзяржаве, 20 ліпеня арганізавалі чырвоныя абозы са збожжам. Калгасы здалі ў лік выкананьня сваіх абавязацельстваў звыш 1.000 кілёграм ячменю першага абмалоту. На мітынгу калгасьнікі заявілі, што яны з гонарам датэрмінова выканаюць свае абавязкі па збожжаздачы высокаякасным зернем.

Рэдакцыя «ЛЕНІНСКІ СЬЦЯГ».

**

ХОЙНІКІ, 22.

У адказ на заклік другога ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, калгасьнікі с.-г. арцелі ІМЯ БУДЗЁННАГА, Дзёрышчанскага сельсавету, здалі датэрмінова пралетарскай дзяржаве сена новага ўраджаю і зьвярнуліся да ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў раёну пасьледваць іх прыкладу. Калгас па-бальшавіцку падрыхтаваўся да ўборкі збожжавых.

У Мсьціслаўшчыне ня турбуюцца

Падрыхтоўка да паставак у Мсьціслаўскім раёне праходзіць яўна нездавальняюча. Возьмем хаця-б пытаньне падрыхтоўкі тэхнічнай базы і забесьпячэньня гэтых пунктаў кадрамі. Адзіным пунктам па прыёмцы збожжа ў Мсьціслаўскім раёне зьяўляюцца Ходасы, між тым ёмкасьць складаў у Ходасах разьлічана ўсяго на 1000 тон, а збожжа павінна паступіць каля 4000 тон. Такім чынам, больш чым на тры чвэрці раён не забясьпечан складзкай плошчай.

У раёне зусім ня турбуюцца аб падборы і забесьпячэньні кадрамі гэтых пунктаў. Зараз не хапае такіх людзей, як загадчык складам, рахункаводы, прыёмшчыкі, таксіроўшчыкі. Да гэтага часу не праверапы складачныя памяшканьні з пункту погляду іх рамонту, санітарнага становішча. У раёне ня ведаюць, ці ёсьць склады да прыёмкі збожжа, ці здольны маючыйся апарат арганізаваць сапраўдную прыёмку. Яшчэ не ўрэгулявана пытаньне аб арганізацыі аплаты здатчыкам збожжа.

Неабходна так арганізаваць работу, каб не дапусьціць ніводнага выпадку несвоечасовай аплаты загатоўчым арганізацыям. Спажыўкаапэрацыя павінна прыступіць да арганізацыі культурнага абслугоўваньня здатчыка. Неабходна арганізаваць чайную і продаж тавараў здатчыкам збожжа. Раённыя арганізацыі павінны ўзяць пад свой непасрэдны кантроль работу загатоўчых арганізацый.

М. Ч.



Камбайны на палёх БССР.

Менская машына-дасьледчая станцыя да 1-га жніўня завозіць у БССР з запароскага заводу «Камунар» збожжавы камбайн для дасьледваньня якасьці яго работы ва ўмовах БССР.

Выпрабаваньне будзе праводзіцца ў саўгасе «Пралетары», Церахаўскага раёну пад непасрэдным кіраўніцтвам навуковых работнікаў машына-дасьледчай станцыі. Пасьля дасьледваньня вынікаў работы камбайну будзе канчаткова вырашана пытаньне аб масавым завозе і ўжываньні камбайнаў у БССР. Пры нармальнай рабоце камбайн «Камунар» зжынае і абмалочвае ў гадзіну каля 2 гэктараў пасеваў збожжавых культур.

РАЗГОРТВАЕЦЦА МАСАВАЕ ЖНІВО

РАГАЧОЎ, 21. (Па тэлеграфу).

Калгас імя Калініна, які абслугоўваецца МТС, першым у раёне пачаў уборку збожжавых. У калгасе ідзе жніво ячменю. 24 ліпеня калгас арганізуе здачу ячменю дзяржаве.

Вярхоўскі.

ПЯТРЫКОЎ, 21.

20 ліпеня калгас «Чырвоны Кастрычнік» першым у раёне пачаў уборку жыта. Зжата 1,8 га. Да жняяркі прыстасован зерняўлоўнік. З 24 ліпеня ў раёне пачынаецца масавая ўборка збожжавых.

МАЗЫР, 22.

Калгасы Крычаўскага сельсавету разгарнулі ўборку азімых. Калгасам «Камінтэрн» зжата 9 га жыта, а «Рухавік рэвалюцыі» — 10 га.

Убіраюць кожны пасьпеўшы кавалак

ЕЛЬСК, 22. Калгасы «Бальшавік», «Перамога», «Чырвоная зара» і імя Калініна прыступілі да ўборкі жыта. Жніво робіцца ў выбарачным парадку на вучастках, дзе пасевы ўжо сьпелыя.

Аднаасобнікі Багучыцкага сельсавету таксама распачалі жніво.

ЛОЕЎ, 21.

Калгас «12 Кастрычнік», Ліпняноўскага сельсавету канчае сенаўборку. 28 цэнтн. сена калгас здаў дзяржаве. 19-га ліпеня калгас пачаў уборку збожжавых у выбарачным парадку. Калгас «Авангард» гэтага-ж сельсавету здаў дзяржаве 13 цэнтнэраў сена з новага ўраджаю.

Сацыялістычная ўзаемадапамога на сенажацях

ВУШАЧЫ, 22. Калгас «Чырвоны жнівень» першым у раёне скончыў уборку сенажацяй і канюшыны і поўнасьцю выканаў плян здачы сена. «Чырвоны жнівень» накіраваў буксірную брыгаду з 40 чалавек на дапамогу ў сенаўборцы суседняму калгасу «Адважны барацьбіт».

Гэтымі днямі «Чырвоны жнівень» пачынае ўборку збожжавых. Актыўны ўдзел у пасьпяховым правядзеньні ўборкі прымае дэлегатка другога ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў Дуброўская Мар'я.

Пачалася ўборка сена

ПОЛАЦАК, 22. (Па тэлеграфу).

У калгасах Ветрынскай МТС пачалося церабленьне ільну. Першым пачаў уборку раньняга ільну калгас «Іскра рэвалюцыі», Шпакоўшчынскага сельсавету.

Уборка праводзіцца ільнацерабілкай «Камсамолка». У першы дзень выцераблена 1 гэктар ільну. «Камсамолка», якая ўпяршыню ўжываецца ў калгасах Ветрынскай МТС, паказала найлепшыя паказальнікі работы.

Калгасы Рэчыцкага раёну рыхтуюць масавыя чырвоныя абозы

РЭЧЫЦА.

21 ліпеня ў раёне пачалася масавая ўборка ячменю і жыта. Да ўборкі прыступілі калгасы Баравікоўскага, Горвельскага і інш. сельсаветаў.

Калгас «10-цігодзьдзе БССР», Дуброўскага сельсавету і «Чырвоны рух», Капуліцкага сельсавету, скончылі ўборку ячменю і прыступілі да ўборкі жыта. Калгас імя Варашылава ўбраў 2 га жыта і ўжо яго абмалаціў. Ураджай выпаў вельмі добры—па 12,5 цэнтн. з гэктара.

Калгас «Чырвонае жыцьцё», Баравікоўскага сельсавету ўбраў 10 га.

Калгасьнікі гэтага калгасу выклікалі на сацспаборніцтва на лепшую ўборку ўраджаю бяз страт і на хутчэйшую здачу збожжа дзяржаве калгас «10-цігодзьдзе БССР».

Ва ўсіх пералічаных вышэй калгасах разгорнута баявая падрыхтоўка да цьвёрдых паставак і арганізацыі чырвоных абозаў у дзень 1-га жніўня.

Фарсаваць будаўніцтва і рамонт прыёмачных пунктаў

Белкаапгароднiна павінна была да 16 ліпеня скончыць пабудову 20-ці прыёмачных пунктаў.

На сёньняшні дзень гатовы для прыёмкі гароднiны толькі чатыры пункты — Бабруйскі, Чачэрскі, Бягомльскі і Плешчаніцкі.

Да будаўніцтва і рамонту астатніх пунктаў і заводаў Белкаапгароднiна зьбіраецца прыступіць толькі зараз.

Белкаапгароднiна з прычыны сваёй безьдзейнасьці паставіла пад пагрозу прыёмку і захаваньне гароднiны.

Неабходна ўсямерна фарсаваць будаўніцтва і рамонт прыёмачных і квасільных пунктаў і заводаў з тым, каб забясьпечыць неабходныя ўмовы для прыёмкі і хаваньня гароднiны.

(БЕЛТА).

Склады ня прыведзены ў гатоўнасьць

ПОЛАЦАК. (БЕЛТА). Міжраённая кантора Загатзбожжа не падрыхтавалася да прыёмкі сена і збожжа. Склады ня прыведзены ў гатоўнасьць. Няма праверанных вагаў. З 15 прэсаў падрыхтавана толькі 8, астатнія патрабуюць рамонту. Дротам прыёмачныя пункты не забясьпечаны. Штат рабочых не падабраны. Ніякага пляну ў рабоце няма. Калгасы і аднаасобнікі здаюць сена да 100 фурманак штодзенна. Многія здатчыкі з сенам ад'яжджаюць назад. Тры пункты прыёмкі збожжа патрабуюць рамонту сьцен, дахаў, падлогі, з 7 вагаў — 5 не ў парадку, апрача гэтага не хапае гір. Апарат падобран на скорую руку, у выніку ў яго пралезьлі п'яніцы, гандляры, гультаі, накшталт Каржова, Лявіта. Кіраўнік Загатзбожжа Шчымелін не вядзе барацьбы з клясава-варожымі элемэнтамі, якія зьвілі сабе гняздо ў Загатзбожжа, а таксама нічога ня робіць па падрыхтоўцы ссыпных пунктаў і складаў. Такое становішча пагражае поўным зрывам загатовак сена і збожжа ў раёне.

ПРЫВІТАНЬНІ 1-ай НАРАДЫ НАЧАЛЬНІКАЎ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ МТС І САЎГАСАЎ

ЦК УсеКП(б)—тав. Сталіну

Дарагі тав. СТАЛІН! Табе, непахіснаму, лепшаму з лепшых ленінцаў, любімаму правадыру сусьветнага камуністычнага руху і рабочай клясы, арганізатару сацыялістычных перамог, начальнікі палітаддзелаў МТС і саўгасаў Савецкай Беларусі шлюць бальшавіцкае, палітаддзельскае прывітаньне.

Мы сабраліся для таго, каб падвесьці першыя вынікі нашай работы і барацьбы за ўмацаваньне новага ладу на вёсцы, за перабудову партыйнай вясковай арганізацыі па вытворчым прынцыпе. Мы сабраліся для таго, каб падзяліцца вопытам у мэтах лепшага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і тваіх указаньняў па правядзеньні ўборачных работ і пастаўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў дзяржаве.

Новая абстаноўка на вёсцы патрабуе новых форм і мэтадаў работы. Палітаддзелы МТС і саўгасаў, якія створаны па тваёй ініцыятыве, закліканы быць вагарамі бальшавіцкай партыі ў справе згуртаваньня лепшых, перадавых сіл калгаснай вёскі, сацыялістычнага перавыхаваньня калгасьнікаў і ўмацаваньня калгаснага ладу.

Мы змагаемся за тое, каб кіраваць кожным калгасам і калгаснай брыгадай; за тое, каб уваходзіць ва ўсе дэталі саўгаснай і калгаснай вытворчасьці. Мы вядзем барацьбу за такую бальшасьць у калгасах, якая пры ўсіх і ўсякіх умовах змагалася-б за ленінскую лінію партыі. Вядучы ўсю гэту работу, мы штодзенна і штогадзінна наглядна пераконваемся ў геніяльнасьці тваёй ідэі аб арганізацыі палітаддзелаў. Твае ўказаньні на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) і на ўсесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў натхнілі энтузіязмам камуністаў, камсамольцаў, рабочых саўгасаў, калгасныя масы ў барацьбе за тое, каб зрабіць усе саўгасы ўзорамі сацыялістычнага гаспадараньня, рэнтабельнымі, усе калгасы бальшавіцкімі, а калгасьнікаў заможнымі.

Няхай жыве бальшавіцкая партыя — арганізатар сацыялістычных перамог!

Няхай жыве наш любімы правадыр, вялікі настаўнік таварыш СТАЛІН!

ЦК УсеКП(б)—тав. Кагановічу

Першая нарада начальнікаў палітаддзелаў МТС і саўгасаў БССР шле лепшаму паплечніку тав. Сталіна, стойкаму бальшавіку — кіраўніку тав. КАГАНОВІЧУ шчырае бальшавіцкае прывітаньне.

Мы падводзім на нашай нарадзе першыя вынікі нашай работы і барацьбы. Мы дзелімся вопытам, бо наперадзе ўборка і пастаўка дзяржаве прадуктаў нашай сельскай гаспадаркі. Мы не забываем, што на рашэньні гэтых задач будзе правярацца бальшавіцкая якасьць нашай работы. Мы добра ведаем, што нам трэба яшчэ многа папрацаваць над тым, каб зрабіць усе саўгасы ўзорамі сацыялістычнага гаспадараньня, усе калгасы бальшавіцкімі, каб ператварыць учарайшага аднаасобніка ў сьвядомага працаўніка сацыялістычнага грамадзтва, каб зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі, канчаткова зруйнаваўшы рэшткі кулацтва.

Дарагі тав. Кагановіч! Мы абяцаем табе, актыўнейшаму арганізатару палітаддзелаў, бальшавіцкай арганізацыяй уборкі і збожжапаставак, шырокай масавай растлумачальнай работай, рашучай барацьбой з рэшткамі кулацтва, з кулацкімі антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі замацаваць і пашырыць пералом, які адбыўся ў сьвядомасьці калгасьнікаў.

Няхай жыве бальшавіцкая партыя!

Няхай жыве паплечнік тав. Сталіна, стойкі бальшавік—кіраўнік тав. Кагановіч!

ЦК КП(б)Б—тав. Гікало

Кіраўніку сацыялістычнага будаўніцтва БССР, Цэнтральнаму Камітэту камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі — палкае бальшавіцкае прывітаньне ад 1-ай нарады начальнікаў палітаддзелаў МТС і саўгасаў.

Мы працуем і ўзмацняем калгасны лад на стыку двух сьветаў. Мы поўнасьцю сабе ўяўляем тое, што зрабіць нашы калгасы бальшавіцкімі і калгасьнікаў заможнымі значыць ня толькі ажыцьцяўляць праграму партыі ва пабудове бяскласавага грамадзтва, але і ўмацоўваць абароназдольнасьць нашай БССР, баявога фарпосту вялікага Савецкага саюзу.

Мы абяцаем ЦК КП(б)Б, пад яго кіраўніцтвам і з яго дапамогай ажыцьцяўляючы гістарычную пастанову ЦК УсеКП(б) ад 15 чэрвеня, перабудоўваючы партыйную вясковую арганізацыю па вытворчым прынцыпе, на аснове вопыту сваёй барацьбы, які мы ўжо маем, па-бальшавіцку ўсе саўгасы, калгасы і калгасьнікаў на вырашэньне задач уборкі і здачы сель.-гас. прадуктаў дзяржаве.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з тав. ГІКАЛО!

Як Глускі райком КП(б)Б „дапамагае" луггасам

Луггасы «Жалы» і «Дзьвесьніца», Глускага раёну, павінны ўбраць 4.500 га сенажаці і здаць дзяржаве больш 5.000 тон сена. На 15 ліпеня на гэтых луггасах было скошана толькі 400 га.

Гэтымі днямі ў раёне адбылася нарада сакратароў сельпарт'ячэек і старшынь сельсаветаў. Дырэктар луггасу «Жалы» тав. Кадакоў у спрэчках выступіў з заклікам аб аказаньні дапамогі луггасам рабочай сілай.

Сакратар райкому партыі тав. Шышковіч у адказ на гэта заявіў, што луггасы раёну ў гэтым годзе ня скосяць і наогул луггасам ня трэба дапамагаць, бо яны яшчэ поўнасьцю не разьлічыліся за зімовую вывазку. Зусім зразумела, што такая «ўстаноўка» толькі на руку клясаваму ворагу, які прабуе сарваць сенаўборку.

Луггасы сапраўды маюць запазычанасьць за вывазку сена, якая будзе ў бліжэйшыя дні ліквідавана. Але «дапамога» райкому ставіць сенаўборку ў гэтых саўгасах пад пагрозай зрыву.

Каламбоцкі, Гіндуш.

Яшчэ ня ўручылі абавязацельстваў

Падрыхтоўка да здачы збожжа і іншай прадукцыі ў Лепельскім раёне праходзіць недапушчальна дрэнна. Даволі ўказаць, што да гэтага часу ня скончана з уручэньнем абавязацельстваў па здачы збожжа дзяржаве. Плян уручэньня абавязацельстваў выканан толькі на 93 проц.

Асабліва недапушчальнае становішча з падрыхтоўкай да збожжаздачы па Ляхаўскім, Сьвядзкім і Сушынскім сельсаветах. Гэтыя сельсаветы нічога не зрабілі для таго, каб своечасова закончыць перадачу абавязацельстваў.

Падрыхтоўка да збожжаздачы не спалучана з правядзеньнем поліва і ўборкі. У радзе сельсаветаў ігнаруецца масавая работа.

Сыстэма Загатзбожжа таксама ганебна зрывае падрыхтоўку да паставак. Даволі сказаць, што да прыёмкі збожжа больш-менш падрыхтован толькі адзін склад. Пытаньне аб кадрах зусім выпала з-пад увагі Загатзбожжа. У самы разгар падрыхтоўкі да паставак адсутнічае рад работнікаў. Аб арганізацыі культабслугоўваньня здатчыкаў нікто нават і ня думае.

Трэба зараз-жа ў корані спыніць гэты апартуністычны самацёк і чыноўніцкае благадушша.

М.

Прыёмачныя пункты не гатовы

РЭЧЫЦА.

У Рэчыцкім раёне пачынаецца ўжо масавая ўборка збожжавых культур. Калгасы падрыхтаваліся да ўборачнай. У Артукоўскім сельсавеце 20 ліпеня калгасы прыступаюць да ўборкі збожжавых культур. У гэтым сельсавеце добра падрыхтаваліся да здачы збожжа дзяржаве з першага абмалоту. Плян распрацован такім чынам, каб за тры дні, як пачнецца абмалот, цалкам разьлічыцца з дзяржавай па здачы збожжа.

Калгасы раёну па-баявому рыхтуюцца да здачы збожжа. Рыхтуюць тару. У многіх калгасах выдзелены спэцыяльныя брыгады возчыкаў. За абмалот і адвоз збожжа дзяржаве адказваюць спэцыяльна выдзеленыя брыгады.

Але ці гатова Загатзбожжа да прыёмкі?

У Рэчыцкім раёне намечаны два загатоўчыя пункты — у Васіленіцкім сельсавеце і ў Рэчыцы. Плошча гэтых прыёмачных пунктаў забясьпечвае плян прыёмкі толькі на 61 проц. Абодвы пункты яшчэ не гатовы да прыёмкі збожжа, не праведзен рамонт, працякаюць стрэхі, ня было яшчэ дэзынфэкцыі. Вагі ёсьць, але яны не правераны і некаторыя паржавелі. Загадчык загатканторы тав. Іваноў усё гаворыць: «Мы адрамантуем, прадызэнфэктуем, дастанем супроцьпажарную ахову».

Да рэчы, аб супроцьпажарнай ахове. Нічога і тут ня зроблена, не хапае агнятушыцеляў, ня ўсюды, дзе трэба, пастаўлены бочкі з вадой. На двары каля прыёмачных пунктаў валяецца шмат яшчыкаў і саломы, што яўна пагражае ў пажарных адносінах. Вартаўнікі не адказваюць свайму прызначэньню і па сваім фізычным стане, і па сацыяльным паходжаньні. Тав. Іваноў сам аб гэтым добра ведае, ён гаворыць: «з 17 вартаўнікоў толькі двух можна пакінуць, а рэшту трэба замяніць, ёсьць чужы элемэнт. Засьмечанасьць у нас вялікая».

Не забясьпечана Загатзбожжа і патрэбнымі кваліфікаванымі кадрамі, не хапае трох рахункаводаў, 3 таксіроўшчыкаў, двух прыёмшчыкаў і трох інструктараў.

Нічога ня зроблена і па культурным абслугоўваньні здатчыкаў. Усё, між іншым, абяцаюць... Людзі, мусіць, думаюць працаваць па-старому — прымаць збожжа праз некалькі месяцаў пасьля ўборкі.

Часу засталося зусім мала. РК КП(б)В павінен разварушыць Загатзбожжа, бо своечасовая прыёмка новага ўраджаю стаіць пад яўнай пагрозай.

ДАШКЕВІЧ.

Першы ўзнос Гомельшчыны—80 тыс. руб.

ЦК—т. ГІКАЛО, СНК—т. ГАЛАДЗЕДУ, рэдакцыі „Зьвязда", ЦСПСБ—т. Кавальчуку

ГОМЕЛЬ. Пераводзім у рэспубліканскі фонд восемдзесят тысяч пяцьсот рублёў, сабраныя на пабудову эскадрыльлі імя тав. Кагановіча. Збор сродкаў працягваецца. Абавязваемся сабраць да 1-га жніўня сто тысяч рублёў на пабудову эскадрыльлі, на зьвяно Гомельчыны ў ёй. Выклікаем Менск, Віцебск, Магілеў, Воршу і ўсе гарады і раёны рэспублікі ўзяць з нас прыклад.

Гарком КП(б)Б ШАФАРЭНКА.

Гарсавет РАЧЫЦКІ.

Гарпрафсавет ЭПШТЭЙН.

**

ЧАШНІКІ, 21. (БЕЛТА). Калектыў рабочых друкарні і работнікаў рэдакцыі газэты «Шлях сацыялізму» ўнёс на пабудову эскадрыльлі імя Кагановіча 85 руб. і выклікаў работнікаў раённых газэт і райсаюзаў Бешанковіцкага і Талачынскага раёнаў.

**

АРГКАМІТЭТАМ ПА ПАБУДОВЕ ЭСКАДРЫЛЬЛІ ІМЯ КАГАНОВІЧА

ПРЫ РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА» АДКРЫТ У МЕНСКІМ ДЗЯРЖБАНКУ БЯГУЧЫ РАХУНАК № 160-700814. ПРОСЬБА ДА ЎСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ НАКІРОЎВАЦЬ САБРАНЫЯ СРОДКІ Ў ФОНД ПАБУДОВЫ ЭСКАДРЫЛЬЛІ НА ГЭТЫ БЯГУЧЫ РАХУНАК.

ПЕРАТВАРАЕМ НАШ КАЛГАС У САПРАЎДЫ БАЛЬШАВІЦКІ

(Ліст старшыні калгасу—дэлегата другога ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў ударнікаў)

Наш калгас «Прамень», Чырвона-Слабодзкага раёну, у мінулым годзе засеяў 270 га і сяўбу мы зацягнулі, не зразумелі важнасьці ранняга севу, капаліся з сяўбою аж 32 дні, што безумоўна дрэнна адбілася на ўраджайнасьці, а гэта значыць—на калгасе ў цэлым і на кожным калгасьніку паасобку.

У гэтым годзе мы ўлічылі ўрокі мінулага, рашуча ўдарылі па старызьне і распрацаваўшы дырэктывы нашай ленінскай партыі і ўраду, загадзя распачалі баявую падрыхтоўку да сяўбы першага году другой бальшавіцкай пяцігодкі.

Дзякуючы праведзенай масава-выхаваўчай рабоце мы стварылі ў калгаснай масе адну думку—сеяць чым найраней, сеяць не абы як, а па-гаспадарску, па сацыялістычнаму і скончыць сяўбу ў найкарацейшы тэрмін.

Падрыхтаваўшы ўсё неабходнае для засеву 495 га яравога кліну, мы 25-IV-33 г. па-бальшавіцку прыступілі да канкрэтнага вырашэньня гэтай баявой задачы і 6-V (праз 12 дзён) пасьпяхова закончылі веснавую сяўбу.

Мы не забыліся, а добра ўсьвядомілі дырэктывы партыі і ўраду пра ўздым ураджайнасьці і ва ўсёй рабоце ўжывалі агрэмерапрыемствы. Ні аднэй бульбіны мы не пасадзілі на ня ўгноеным полі. Ячмень засеялі выключна радковым севам і пад гной. Ні адна культура не засеяна ў нас у аднавор і ўсё гэта дасягнута таму, што ў нас існавала і існуе не фармальна, а на справе сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж сталымі і моцна арганізацыйна скалочанымі брыгадамі, спаборніцтва паміж кожным калгасьнікам і калгасьніцай у паасобку. Дзякуючы-ж гэтаму ў нас конь, галоўная фігура цяглавай сілы калгасу, быў і застаецца ў надзейных руках, а таму мы і вышлі з перамогаю ў сяўбе.

Адпачываць не было калі. Мы адразу-ж пераключыліся на падрыхтоўку да праполачнай, уборачнай і ворыва папару.

Праполку да 5-VII так-жа бліскуча як і сяўбу мы скончылі. У нас прапалата 50 га аўсу, 30 га ячменю, гэтыя культуры прапалоты адзін раз, бо больш не патрабавалася. Лён прапалоты два разы на плошчы ў 10 га, гародніны—12 га і тутуню прапалата адзін раз 4,3 га.

Бульба ў нас расьце як на дражджах і на плошчы ў 70 га ўжо абагнана два разы.

Набліжаліся цёплыя летнія дні, надыходзіў час сенакашэньня. Зазьвінелі косы, выкаціліся ў баявой гатоўнасьці касаркі і касцы нашы стройнымі брыгадамі, а за імі брыгады жанчын па сушцы сена рынуліся ў бой за сена і ўжо на 9-VII мы скасілі і ўбралі з меўшыхся 150 га сенажаці 85 проц. зялёнага, сухога і пахучага сена. А зараз мы ўжо з сенажацьцю разьлічыліся, запісалі і на гэтым баявым вучастку нашу перамогу.

Адданасьць калгасьнікаў і калгасьніц калгаснай справе, справе ленінскай партыі і ажыцьцяўленьне партыйных дырэктыў усё вышэй узьнімала сьвядомасьць калгасных мас, узмацняла іх клясавую пільнасьць.

Нельга не адзначыць нашых лепшых ударнікаў. Трэцяя брыгада на чале з брыгадзірам СЯКЕРЫЧАМ ВАСІЛЁМ ідзе ўвесь час у перадавых шэрэнгах калгасу. Лепшыя калгасьнікі гэтай брыгады — ХОДЗІН ІВАН, ЛАТУШКА М. В. (старэйшая свайго зьвяна), СЬНЕЖКА П. Н. лепшы конюх гэтай брыгады.

Першая брыгада спаборнічае з трэцяй. На чале яе—брыгадзір т. ЧАЙКО П. А. Лепшыя ўдарнікі гэтай брыгады ЛАЧУХА АЛЕСЬ і ХОДЗІН ЯЗЭП. І першая брыгада не адставала, а раўнялася па перадавой трэцяй брыгадзе.

Чым-жа тлумачацца посьпехі і бліскучыя перамогі, якія наш калгас запісваў у дзёньнік барацьбы.

Першае і галоўнае, гэта—клясавая пільнасьць і непрымірымасьць да ня дабітага ворага-кулака. А гэта дасягаецца дзякуючы штодзённай масава-выхаваўчай рабоце ў брыгадах, сіламі камуністаў, камсамольцаў і лепшых найбольш сьвядомых, адданых партыі беспартыйных актывістаў.

Па-першае, у нас, як правіла, кожны дзень перад работаю па-брыгадна праводзілася і праводзіцца ранішняя палітзарадка. 10-15 хвілін часу на зарадку, дзе брыгадзір-агітатар коратка паведамляе калгасьнікам і калгасьніцам вынікі прароблены работ мінулага дню. Ён засяроджвае ўвагу на галоўнай задачы данага дню, паведамляе як ідуць баявыя работы на палёх у калгасе, якія знойдзены недахопы, як іх зжыць і якія ёсьць дырэктывы з раёну або цэнтру.

У абедзены перапынак рэгулярна чытаюцца газэты. Зачытваюцца зводкі аб ходзе работ па БССР і СССР і як праходзіць конкурс з Заходняй вобласьцю. Растлумачваюцца дырэктывы партыі і ўраду, што друкуюцца ў газэтах і маса калгасьнікаў жыва і бадзёра абмяркоўвае як найлепш, правільна і найхутчэй ажыцьцявіць іх ва ўмовах свайго калгасу, каб не адстаць, бо лёзунг тав. Сталіна «адсталых б'юць» нашы калгасьнікі добра ўсьвядомілі.

Пасьля ўдарнай штодзённай работы, вечарам па-брыгадна праводзяцца кароткія, але дзелавыя вытворчыя нарады з абгаварэньнем якасьці работы і г. д.

Мы не забыліся і пра тое, што «друк наш—самая моцная, самая вострая зброя партыі». За час сяўбы і праполкі ў нас выпушчана ў першай брыгадзе 22 палявых газэт, у другой—19 і ў трэцяй—25, а таксама выпушчана 8 нумароў агульна-калгаснай насьценгазэты.

Газэты адыгралі велізарнейшую ролю, яны разгарнулі шырокую, здаровую, бальшавіцкую крытыку і самакрытыку і выдатна змагаліся за якасьць работы, за ўздым ураджайнасьці.

Камісія па прыёмцы работ рэгулярна і без далейшай затрымкі перадавала вынікі работы ў газэты, а калгасьнікі і калгасьніцы жыва чыталі іх і абмяркоўвалі.

Да ўборкі мы поўнасьцю падрыхтаваны і праводзем яе так-жа арганізавана, па-бальшавіцку і без страт. У нас у поўнай гатоўнасьці дзьве касаркі, дзьве жаткі-пабагрэйкі, адна новая сноязвязалка і двое конных грабель. Сярпы адточаны. Перавяслы для ячменю з кулявой саломы навіты ў патрэбнай колькасьці.

Мы пастанавілі па пляну работ закончыць усю ўборку ураджаю разам з клеверам за 20 дзён і ўзялі на сябе абавязак з 1 па 15 жніўня поўнасьцю да аднаго кілёграма выканаць хлебаздачу дзяржаве, а таксама за першую шасьцідзёнку ўборкі бульбы адразу-ж з поля здаць поўнасьцю належную з нас колькасьць бульбы, закончыўшы адгрузку яе не пазьней 9-X-33 г. Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з т. Гікало, пад кіраўніцтвам райпартарганізацыі і палітаддзелу МТС, мы ўзятыя на сябе баявыя абавязкі перад нашай пралетарскай дзяржавай безумоўна выканаем у тэрмін як колькасна, так і якасна.

Ні на хвіліну не паслабляючы работы і клясавай пільнасьці, уздымаючы на вышэйшую творчую сацыялістычную энэргію, зробім наш калгас моцнай бальшавіцкай апорай ленінскай партыі і ўраду, а калгасьнікаў заможнымі.

СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ, «ПРАМЕНЬ»—ДЭЛЕГАТ II УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ МІХАСЬ ГАРБАЧ.

Ад рэдакцыі: Друкуючы ліст тав. Гарбача рэдакцыя заклікае ўсе калгасы браць прыклад з калгасу «Прамень», (аб якім «Зьвязда» у свой час разгорнута пісала і вопыт яго работы перанесьці на калгасныя палі ўсёй БССР.

МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА «15 ГОД РСЧА» Ў МАСКВЕ.

Карціна мастака Кардоўскага «Сталін, Варашылаў, Кагановіч і Молатаў на манэўрах»

Партыйнае будаўніцтва

ЗАМАЦАВАЦЬ ПОСЬПЕХІ, ДАСЯГНУТЫЯ Ў ЧАСЕ ЧЫСТКІ

Шырэй разгортваць падрыхтоўку там, дзе чыстка яшчэ не праходзіла

РЫНГ
старшыня Плешчаніцкай раённай камісіі па чыстцы КП(б)Б

Зрабіць адпаведныя вывады

Падрыхтоўчая работа да чысткі ў некаторых ячэйках (Хатаевічы, Камена) выявілася ў тым, што на сходах ячэек заслухалі даклады аб пастанове ЦК і ЦКК і зачыталі інструкцыю. Растлумачальная работа сярод калгасьнікаў і аднасобнікаў не праводзілася. Падрыхтоўка да чысткі ў гэтых ячэйках ня была зьвязана з мабілізацыяй мас на хутчэйшае выкананьне плянаў уздыму папару, праполкі і падрыхтоўкі да ўборкі.

Але-ж большасьць ячэек (Крайская, Завішынская і рад іншых) разгарнулі досыць шырокую падрыхтоўчую работу: як сьлед прапрацавалі матар'ялы да чысткі на сходах ячэек, стварылі самаправерачныя брыгады, правялі растлумачальную работу аб задачах чысткі сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, мабілізавалі масы на своечасовае выкананьне плянаў уздыму папару і праполкі.

Гэтыя ячэйкі сустрэлі чыстку значнымі дасягненьнямі. Па Прусаўскім сельсавеце да пачатку чысткі плян сяўбы выканан на 104 проц. Ганцаўская парт'ячэйка здолела забясьпечыць выкананьне пляну сяўбы на 101 проц.

Ясна відаць рэзультаты падрыхтоўчай работы па выкананьні пляну ўздыму папару, які ў вызначаны партыяй тэрмін быў выканан па раёну на 104,3 проц. Набліжаецца да канца праполка збожжавых, шырока разгарнулася сенаўборка і падрыхтоўка да ўборкі збожжавых.

Разам з гэтым чыстка ячэйкі райза, Завішынскай і Каменскай павінна стаць для плешчаніцкай партарганізацыі вялікім палітычным урокам.

Хто быў у гэтых ячэйках? Член партыі Шэлег—нам. заг. райза, былы кулак, пры ўступленьні ў партыю ўтаіў сваё сацыяльнае паходжаньне. Будучы старшынёй калгасу, Шэлег прыняў кулакоў у калгас, хадайнічаў за свайго айчыма—буйнога кулака, атрымліваў матар'яльную дапамогу ад кулакоў. Будучы ў райза, ён даваў зьменшаныя пляны сяўбы і ўздыму папару па сельсаветах.

Кандыдат партыі старшыня Завішынскага сельспажыўтаварыства Папкоў В.—дэзэртыр Чырвонай арміі, судзіўся, меў сувязь з бандытамі, займаўся самаснабжэньнем.

Чыстка ячэек выявіла факты засьмечанасьці калгасаў Ганцаўскага, Каменскага і іншых сельсаветаў кулацкімі элемэнтамі.

Гэта паказвае, што ў асобных зьвеньнях партарганізацыі Плешчаніцкага раёну не завастрылі сваёй клясавай пільнасьці. Кіраўніцтва раёну павінна ўмацаваць вясковыя ячэйкі, дабіцца таго, каб яны ведалі людзей, з якімі працуюць, і кіравалі іх працай.

Яшчэ і на сёньня райпартарганізацыя непасрэдна ня прыступіла да перабудовы ўнутрыпартыйнай работы на аснове апошняй пастановы ЦК УсеКП(б) аб палітаддзелах МТС, калгаснай ячэйцы і ўзаемаадносінах паміж райкомамі і палітаддзеламі. З 19 вясковых ячэек была толькі адна калгасная, а са 122 правераных камуністаў толькі 46 проц. непасрэдна працуе ў калгасах.

Адсюль задача партарганізацыі — перабудаваць унутрыпартыйную работу ў ячэйках, перанесьці цэнтр іх работы на калгасную вытворчасьць, стварыць калгасныя ячэйкі, правільна расставіць людзей, узмацніць камуністамі калгасныя брыгады, разгарнуць партыйна-масавую работу.

На сходзе па чыстцы Каменскай ячэйкі член партыі, старшыня калгасу тав. Коцар дзяліўся вопытам сваёй работы, як ён разбураны, засьмечаны кулацкімі элемэнтамі калгас зрабіў бальшавіцкім. Коцар дабіўся ўкараненьня сьдзельшчыны ў кожнай брыгадзе, мабілізаваў партыйцаў, камсамольцаў і калгасьнікаў на ачышчэньне калгасу ад кулацкіх элемэнтаў, на разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Калгас перавыканаў плян сяўбы і дапамог адстаючым калгасам.

Такі-ж малюнак мы маем і ў калгасе «Новы шлях», Завішынскага сельсавету, дзе старшынёй калгасу тав. Вугольнік. Калгас перавыканаў плян сяўбы і дапамог насеньнем некаторым калгасам Завішынскага і Хатаевіцкага сельсаветаў.

Чаму не перанесьці вопыту работы гэтых калгасаў на калгасы, якія яшчэ і на сёньня працуюць нездавальняюча?

Чыстка праходзіць пры вялікай зацікаўленасьці партарганізацыі і беспартыйных калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Сходы ячэек, дзе 5-10 камуністаў, наведвала па 100-120 калгасьнікаў і аднаасобнікаў. У Завішанскім, Каменскім і Ганцаўскім сельсаветах былі факты, калі кулацкія элемэнты імкнуліся скампрамэтаваць паасобных членаў партыі, але гэтым спробам камісія дала жорсткі адпор.

Камісія па чыстцы сустрэлася і з фактамі заціску самакрытыкі, кругавой парукі. У саўгасе Замошша б. дырэктар, член партыі тав. Навікаў забараняў гаварыць на сходзе рабочым. У Замошшы камісіі прышлося праводзіць спэцыяльныя сходы партыйцаў, каб выклікаць сапраўдную крытыку і актыўнасьць мас.

Вынікі праверкі паказалі, што палітычны ўзровень партыйцаў надзвычай нізкі, а паасобныя камуністы зусім палітычна непісьменныя. Галоўная віна ў гэтым ускладаецца на райком: ён абсалютна бязьдзейнічаў у справе арганізацыі вучобы.

Сакратару ЦК КП(б)Б—т. ГІКАЛО, Рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б—т. т. АНТІПОВУ, САХАРОВОЙ і ЛЫЧОВУ

Сёньня БЯГОМЛЬСКАЯ арганізацыя КП(б)Б падвяла рэзультаты чысткі партарганізацыі раёну. Чыстка вызваліла нашу партарганізацыю ад перараджэнцаў, ашуканцаў, разлажыўшыхся і чужых элемэнтаў. Чыстка ўмацавала нашу партарганізацыю, узьняла яе палітычны ўзровень і аўтарытэт сярод калгасьнікаў і рабочых аднаасобнікаў. Дзякуючы гэтаму наш раён перавыканаў плян веснавой сяўбы, плян мабілізацыі сродкаў другога кварталу, плян лесавывазак і ворыва папару.

Райпартсход Бягомльшчыны запэўняе ЦК КП(б)Б і яго кіраўніка тав. ГІКАЛО, што правераная партарганізацыя будзе па-бальшавіцку змагацца за поўнае і своечасовае выкананьне задач, што стаяць перад ёю, і выведзе раён у перадавыя па ўборцы і збожжаздачы.

ПРЭЗЫДЫУМ РАЙПАРТСХОДУ.

Падрыхтоўкай да чысткі ніхто ня кіруе

Крычаўская райпартарганізацыя за апошнія 3-4 гады значна вырасла і ўмацавалася. У часе чысткі партыі ў 1929 годзе ў арганізацыі налічвалася ўсяго каля 200 членаў і кандыдатаў партыі, а процант рабочага асяродзьдзя ледзь даходзіў да 15-ці. Зараз у арганізацыі 500 членаў і кандыдатаў, у раёне ёсьць 17 вытворчых парт'ячэек. Значна ўзрос у агульным складзе арганізацыі процант рабочых, непасрэдна занятых на вытворчасьці.

Крычаўская арганізацыя зусім маладая. Каля 80 проц. яе складу першы раз праходзяць чыстку.

Як-жа маладым камуністам растлумачаны задачы чысткі, як яны гатовы да яе?

У большасьці ячэек раёну праведзены сходы з дакладамі аб задачах чысткі. Дзе-ні-дзе ў «вольныя» гадзіны» займаюцца вывучэньнем статуту і праграмы партыі. Але на якасьці праведзеных сходаў, па цэламу шэрагу ячэек, варта застанавіцца.

У прамысловай ячэйцы, пытаньне аб чыстцы «прапрацавана» ў прысутнасьці толькі палова камуністаў. На гэтым сходзе з 400 членаў арцелі прысутнічалі 8 чал. «Даклад» сакратара ячэйкі тав. Бакшылава аб чыстцы працягваўся 12 хвілін. І бюро ячэйкі лічыць, што задачы чысткі прапрацаваны.

Сакратар парт'ячэйкі кар'еру—аднаго з рашаючых вучасткаў будаўніцтва цэмэнтнага заводу тав. Кінес аўтарытэтна заявіў, што ў яго ячэйцы пытаньне аб чыстцы «ўсебакова абгаворана». Аднак зусім іншае гавораць члены гэтай ячэйкі т. т. Філімонава, Арлоў і інш.—«Кінес вас ашукаў. Ніякага сходу ў нас не праводзілася, аб чыстцы мы нічога ня ведаем».

Так абстаіць справа з падрыхтоўкай да чысткі ў ячэйцы заводу, дзе за чэрвень месяц плян дабычы сырцу ў кар'еры выканан усяго на 76 проц., дзе з прычыны злачынных адносін да складанейшых мэханізмаў, рад каштоўных машын выведзены са строю і работа на кар'еры замест 3-х праводзіцца ў адну зьмену.

У ячэйцы ЭСМО цэмэнтнага заводу падрыхтоўчая работа да чысткі фактычна змазана. Бюро ячэйкі абмежавалася 15-ці хвілінным паведамленьнем аб чыстцы, прычым дакладчык направільна арыентаваў ячэйку, ні-бы камуністы-рабочыя чыстку не праходзяць.

Па некаторых ячэйках падрыхтоўка да чысткі, з прычыны адсутнасьці кіраўніцтва з боку райкому партыі, не скарыстоўваецца для ўзьняцьця актыўнасьці камуністаў, рабочых і калгасных мас на ўдарнае выкананьне заданьняў партыі. Прыкладам можа служыць каапэрацыйная ячэйка. Дзяржаўныя закупкі збожжа выкананы ў раёне ўсяго на 36 проц. Апарат райсаюзу не мабілізован для аказаньня дапамогі сельно ў арганізацыі закупак. Прамтаварныя фонды, што адпушчаны для закупак, у райсаюзе разбазарваюцца направа і налева. Ня лепш з праполачнай кампаніяй. І вось гэтыя важнейшыя пытаньні ў часе падрыхтоўчай работы да чысткі ячэйкі ня турбуюць. Палітзаняткі праводзяцца адарвана ад важнейшых задач практычнай работы.

За тое бюро гэтай ячэйкі ўжо прапрацавала лёс асобных камуністаў, дапусьціўшы пры гэтым буйнейшыя скрыўленьні.

Члену бюро ячэйкі тав. Мовэ, які ў 1929 годзе быў вычышчан з партыі, потым адноўлен з папярэджаньнем аб выпраўленьні ім сваіх гэтых недахопаў, ня выправіў іх, было даручана тэрмінова скласьці на ўсіх камуністаў ячэйкі характарыстыкі. Гэта даручэньне Мовэ скарыстаў для зьвядзеньня асабістых рахункаў. Актыўнаму камуністу, адзінаму ў гэтай ячэйцы рабочаму, з 9-ці гадовым стажам тав. Вэртлібу Мовэ даў характарыстыку: — Вэртліб дрэнна змагаецца за генэральную лінію партыі».

Такую характарыстыку Вэртліб «заслужыў» тым, што крытыкаваў старшыню гарпо Мовэ за тое, што апошні ўкамплектаваў свой апарат спэкулянтамі. Тут мы бачым недапушчальнае скрыўленьне інструкцыі па чыстцы, фактам складаньня напятровых характарыстык, што яшчэ больш усугубляецца тым, што складаньне іх выкарыстоўвалася для зьвядзеньня асабістых рахункаў. Такія скрыўленьні ня сустракаюць патрэбнага адпору.

Зусім слаба разгортваецца падрыхтоўчая работа да чысткі партыі ў Касьцюшскай, Міхееўскай, Паленіцкай ячэйках. І таму зусім не выпадкова, што плян праполачнай кампаніі ў раёне сарваны, сарвана і ворыва папару, недапушчальна слаба разгортваецца падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі.

Г. Фонкац.

Аб арганізацыі атэстацыйна-іспытных камісій на чыгуначным транспарце

За подпісам Наркамшляхоў зносін тав. АНДРЭЕВА выдан загад, паводле якога ўсе назначэньні і перамяшчэньні гаспадарча - тэхнічных кадраў на чыгуначным транспарце як камуністаў, так і беспартыйных, павінны праводзіцца шляхам папярэдняй праверкі іх атэстацыйна-іспытнымі камісіямі. Камісіі ў раёнах складаюцца пад старшынствам начальнікаў раёну і членаў—намесьніка начальніка раёну і начальніка палітаддзелу. На станцыях, у дэпо, на дыстанцыях і будучастках атэстацыйна-іспытныя камісіі складаюцца пад старшынствам адпаведных начальнікаў і членаў: памочнікаў начальнікаў, парторгаў буйных вузлоў і сакратароў партыйных ячэек.

Для ацэнкі тэхнічнай падрыхтоўкі атэстуемых камісіі павінны прыцягваць выдатных спэцыялістаў і практыкаў. Камісіі праводзяць атэставаньне ў парадку чаргі і без чаргі. Апошняе праводзіцца як выключэньне пры зьняцьці работніка, выпушчэньні на вышэйшую пасаду і інш. Паводле загаду работу атэстацыйна-іспытных камісій трэба пачаць неадкладна, скарыстаўшы для гэтага ўсе матар'ялы, якія падрыхтаваны ў гэтым годзе па атэставаньні.

Менск да прызыву ня рыхтуецца

Падрыхтоўчая кампанія да прызыву ў РСЧА зьяўляецца важнейшай палітычна-масавай кампаніяй, якая садзейнічае ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны і баявой магутнасьці Чырвонай арміі. Даць для РСЧА клясава-вытрыманае, палітычна-сьвядомае, агульна-пісьменнае, фізычна-здаровае папаўненьне — справа ўсіх партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый.

Кожная партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыя заводу, калгасу, саўгасу павінна на працягу усяго падрыхтоўчага перыяду да прызыву, пабудаваць сваю работу так, каб на справе забясьпечыць актыўны ўдзел кожнага прызыўніка ў бягучых гаспадарча-палітычных кампаніях, у барацьбе за якасьць, за выкананьне свайго прамфінпляну. Кожны папрызыўнік павінен атрымаць актыўны ўдзел у клясавым адборы ў РСЧА, дабівацца поўнай ліквідацыі сярод прызыўнікаў непісьменнасьці і малапісьменнасьці, дабівацца іх актыўнага ўдзелу ў працы Асоавіяхіму, масавай здачы норм на значок ГПА.

Становішча падрыхтоўчай кампаніі да прызыву грамадзян 1911 году нар. па Меншчыне, па двух такіх асноўных пытаньнях, як клясавы адбор і ліквідацыя непісьменнасьці і малапісьменнасьці, праходзіць нездавальняюча.

На сёньняшні дзень да ліку лепшых прадпрыемстваў і сельсаветаў, якія па сапраўднаму і па-бальшавіцку вядуць гэту работу, можна далучыць толькі фабрыку «Акцябр», завод імя Молатава, Грычанокі, Самахвалаўскі і Ратамскі сельсаветы.

Ня дрэнна ўключыліся ў падрыхтоўчую кампанію да прызыву абутковая фабрыка, фабрыка імя Кагановіча і прафсаюз будаўнікоў. Прызыўнікі гэтых прадпрыемстваў і сельсаветаў у ліку 200 з лішнім чалавек—актыўныя змагары за выкананьне вытворчых плянаў сваіх прадпрыемстваў.

Але такая работа ва ўмовах Менску, сталіцы БССР, па якой павінны раўняцца астатнія раёны, прыкладам служыць ня можа.

Мы маем выпадкі, калі ў ліку лепшых прызыўнікоў выяўляюцца клясава-варожыя элемэнты. Напрыклад, Плодагародтрэст ахарактарызаваў прызыўніка Школьніка лепшым з лепшых ударнікаў, між тым яго бацькі да 1917 году былі буйнымі гандлярамі і зараз уся сям'я пазбаўлена выбарчых правоў.

Зараз ЦК КП(б)Б вынес пастанову, якая абавязвае ўсе партыйныя ячэйкі выправіць апартуністычныя адносіны у падрыхтоўчай кампаніі да прызыву.

Пастанова папярэджвае ўсе партыйныя ячэйкі Меншчыны, што вінаватыя за зрыў гэтага важнейшага пытаньня будуць прыцягнуты да суровай партыйнай адказнасьці.

Задача партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый саветаў і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці — безадкладна ўключыцца ў падрыхтоўчую кампанію і застаўшыяся месяцы ліпень і жнівень—поўнасьцю выкарыстаць для ліквідацыі ўсіх прарываў, каб прызыў правесьці ўзорна, першымі ў БССР. Значная частка прадпрыемстваў, як трамвайны парк, Эльвод, завод «Камунар», ужо ўключыліся ў гэту работу, справа за астатнімі.

Глебец.

Э. Карон і Б. Гозман

Да чаго прывялі канцылярска-бюракратычныя мэтады кіраўніцтва

Для пачатку — некалькі важкіх лічбаў. 1932 вытворчы год Бабруйскі лесакамбінат закончыў са стратай у 632 тыс. рубл. Страты камбінату за месяцаў 1933 году дасягнулі сумы ў 87 тыс. рубл. Сабекошт асноўнага віду прадукцыі камбінату — піламатар'ялаў — па вядучаму лесацэху № 1 на 5 проц. вышэй пляну і на 29 проц. вышэй мінулагодняй. Гэта — рэзультат работы 1-га кварталу. І няма ніводнага сярод тузіны цэхаў камбінату, які-б у першым квартале ўклаўся ў нарад-заказ — гэта значыць, які працаваў-бы без страт і без значнага павышэньня сабекошту.

Нас могуць запытаць: зараз ужо ліпень, чаго-ж вы апэруеце лічбамі за даўно мінулы першы квартал?

Адказ вельмі просты: справаздачная калькуляцыя за другі квартал будзе гатова не раней жніўня. Выражаючыся літаратурна, зараз жаркі ліпень, а на палёх апэрацыйна-справаздачных ведамасьцяй толькі прабіваецца першая засмелая вясеньняя траўка; калькуляцыі камбінату знаходзяцца яшчэ ў палоне майскіх спраў і настрояў.

Да чаго гэта практычна прыводзіць? Скажам, стандартны цэх камбінату выпусьціў партыю дамоў. Дамы запрададзены, выпушчаны, адгружаны куды-небудзь у Данбас, там на месцы сабраны, абжыты, быць можа, ужо просяць у капітальны рамонт, а на Бабруйскім камбінаце ўсё яшчэ падлічваюць, колькі-ж каштавала іх зрабіць...

Камбінацкі ўлік ва ўсіх сваіх зьвеньнях наскрозь зусім незадавальнены. Перш за ўсё, ён не апіраецца на мала-мальскі дзейны першапачатковы дакумэнт. ...гаворачы ўжо аб сыстэме ўліку, дакладна не ва ўсіх вучотчыкаў можна падасьці. І на самай справе. Як можа быць, каб разьдзелачная рама ва лесацэху давала ў дзень каля 200 проц. максымальнай тэхнічна-магчымай нормы? Гэта практычна значыць, што прыпіскамі, перавышэньнем фактычнай выпрацоўкі вучотчык абкрадзе дзяржаву.

Але на гэта чамусьці ніхто не рэагуе, да гэтага прывыкаліся, вучотчыкаў не правяраюць, не заўсёды нават ведаюць, што гэта за людзі па свайму ...ежаваму твару.

Як атрымалася, што база сырцу мела ў першым квартале 523 тыс. рубл. страты па прыёмцы і выкатцы піловачніку? Вучотчыкі прымалі ў сплаўнай ...торы сырэц поўнацэнны, а здавалі потым у цэхі зачастую як трэцягатовы сухастой. З прычыны якой ...рнай магіі» начальнік біржы піладрэвіны лічыць, што ён меў у першым квартале 12 тыс. рубл. эканоміі, калі галоўная бухгальтэрыя лічыць, што біржа, з-за перавыдаткаў па ўкладцы і транспарту мела 90 тыс. рублёў страт? Урэшце, каму больш верыць? Ці стандартнаму цэху, які сам лічыць, што выканаў вытворчую праграму за першае паўгодзьдзе на 79 проц., ці пляноваму аддзелу камбінату, які апэруючы тымі-ж данымі, называе па стандартнаму цэху лічбу выкананьня 91 проц.?

Зразумела, ня кепскі ўлік галоўная прычына і корань камбінацкіх прарываў. Прычына ляжыць, па сутнасьці, глыбей — у фактычным ігнараваньні шасьці ўмоў тав. Сталіна. Узяць, напрыклад, кардынальнае пытаньне аб гасразьліку. Па афіцыяльнай заяве галоўнага бухгальтара камбінату т. Хазукава, на камбінаце з студзеня 1933 году гасразьліку ня існуе. «Аб'ектыўная» прычына: да мая ня было нарадаў-заказаў, значыць ажыцьцяўляць гасразьлік было нельга... Дырэктар камбінату тав. Тарасаў у сваёй шчырасьці ідзе яшчэ далей. Ён паведамляе заводзкай канфэрэнцыі:

— На камбінаце, па сутнасьці справы, няма ніводнай сапраўднай сацыялістычнай гасразьліковай брыгады. І сапраўды, гасразьліку ў цэху і брыгадзе няма. Гасразьлік — «бяспрытульны». Цэхі вядуць паміж сабою сярэчкі, але не на базе якіх-небудзь дагаворных адносін, а так проста, «на аснове сваёй пралетарскай сьвядомасьці», як іранізуе (ці не над самім сабою?) той-жа Тарасаў.

Калі ўзяць другую ўмову т. Сталіна — аб ліквідацыі ўраўнілаўкі,— дык і тут малюнак далёка не вясёлы. Брыгада беларускага навукова-дасьледчага інстытуту сустрэлася са шматлікімі фактамі ўраўнілаўкі ў зарплаце, пабудаванай на аснове арцельнай формы сьдзельшчыны на пагрузачных работах, на ўкладцы на біржы піламатар'ялаў і г. д.

Ня выкананы на камбінаце рашэньні XVII партканфэрэнцыі аб перабудове тэхнармаваньня. Яно ня толькі ня стала асновай арганізацыі вытворчасьці, а наадварот, знаходзіцца ў паўнейшым загоне. Былое ТНБ, згодна загаду Наркамлесу, зьмяніла шыльду і цяпер называецца САП — (сэктар арганізацыі працы), але сыстэма і сутнасьць работы не зьмянілася.

Адміністрацыя некаторых цэхаў зацікаўлена ў тым, каб нормы выкарыстоўваньня абсталяваньня і рабочай сілы былі ўстаноўлены няправільныя, зьніжаныя. Былі агідныя выпадкі, калі майстры пры хранамэтражы проста загадвалі рабочым-ударнікам зьніжаць прадукцыйнасьць працы. Яшчэ больш скандальна: у беладрэўным цэху зьмены майстры проста праганялі хранамэтражыстаў...

Ніхто і на гэтыя факты не рэагаваў. Майстар цэху, наперакор дакладным дырэктывам партыі, ня толькі не адчувае сябе адказным за правільнае ўстанаўленьне норм, але проста падрывае работу нармоўшчыкаў.

Інструктажу, як аднаго з асноўных мэтадаў укараненьня навукова-абгрунтаваных тэхнічных норм, на камбінаце ня ведаюць. Да і хто будзе яго па-сапраўднаму ажыцьцяўляць, хто будзе будаваць інструкцыйныя карты, калі ў буйнейшых цэхах, налічваючых па 800 чалавек (беладрэўным) начальнікамі зьмен зьяўляюцца прафшкольцы, якія толькі нядаўна пакінулі школьную лаўку?

Затое штат кіраўніцтва камбінату налічвае 130 чалавек. Фонд зарплаты па галоўнай канторы перавыдаткоўваецца. Рады статыстык, якія малююць дыяграмы ў тэхаддзеле кіраўніцтва, атрымліваюць 250 рублёў пэнсій, да руб. 50 звышчасовых штомесячна. І ў той-жа час начальнікі цэхаў атрымліваюць усяго па 275 рубл., а тэхнікі па цэхах па 175-200 рубл.

Чым-жа займаецца гэты вялікі штат інжынэраў, тэхнікаў, эканамістаў заводакіраўніцтва? Капаецца ў паперках і, па вобразнаму прызнаньню галоўнага інжынэра тав. Варанцова, «шпіёніць» за цэхамі. Цэхі быццам-бы скрываюць свае недахопы, а вытворчаму аддзелу прыходзіцца іх выкрываць.

І, вядома, не бяз прычыны работнікам тэхаддзелу ў цэхах далі назву «маятнікаў». Яны швэндаюцца без сыстэмы па камбінату. Дакладнага падзелу функцый ні паміж цэхамі і тэхаддзелам, ні нават унутры тэхаддзелу няма. У выніку — абязьлічка ў кіраўніцтве: за тэхнічнае плянаваньне адказваюць, напрыклад, і цэхі і тэхаддзел, усе разам і ніхто паасобку.

— У нас няма тэхпрамфінпляну, — заявіў тав. Варанцоў на заводзкай канфэрэнцыі, — а ёсьць нешта падобнае да гандлю між намі і цэхамі.

І так, «шпіянаж» замест дапамогі, «гандаль» замест аўтарытэтнага тэхнічнага кіраўніцтва, «ублюдачныя» паперкі замест тэхпрамфінпляну.

Ці дапусьціма далей такое агіднае становішча? Ці магчыма цярпець такую канцылярска - бюракратычную сыстэму кіраўніцтва?

Гэтыя апаратныя мэтады кіраўніцтва характэрны ня толькі для адміністрацыі камбінату, але і для партыйнага кіраўніцтва камбінату. Партком ня сумеў узьняць энэргію мас на барацьбу за якасныя паказальнікі, за асваеньне тэхнікі. І лепшым доказам гэтаму зьяўляецца бясслаўны правал вялікай камбінацкай канфэрэнцыі па сабекошту і якасьці прадукцыі. Ні аб якой масавай падрыхтоўчай рабоце да канфэрэнцыі партком не падумаў. Збору рацыяналізатарскіх прапаноў ня было. Рабочыя ня ведалі нават аб канфэрэнцыі. Ніякіх выбараў на канфэрэнцыю ня было праведзена. Проста напярэдадні канфэрэнцыі разаслалі сакратарам цэх'ячэек дэлегацкія мандаты і сакратары без усялякіх выбараў раздалі гэтыя мандаты каму папала. Ці трэба зьдзіўляцца, што ўжо на другое пасяджэньне канфэрэнцыі зьявілася замест 400 дэлегатаў усяго чалавек 80, і што на канфэрэнцыі амаль ня было ніводнага выступленьня рабочага ад варштату? Ніякіх рэзалюцый канфэрэнцыя ня прыняла...

Адзначым, у выглядзе яшчэ адной рыскі да характарыстыкі масавай работы на камбінаце, поўную бязьдзейнасьць клюбу камбінату. За чэрвень-ліпень у клюбе ня было ніводнай лекцыі, ніводнага спэктакля, ніводнага нават кіно-сэансу. Дае-ж тут гавараць аб удзеле клюбу ў барацьбе за прамфінплян!

Важнейшае зьвяно, за якое зараз належыць ухапіцца — гэта гаспадарчы разрахунак. Трэба даць цэхам неадкладна сапраўды гасразьліковыя нарады-заказы. У 3-м квартале ніяк нельга адгаварвацца адсутнасьцю гадавога пляну. Трэба ўмацніць работу гасразьліковых брыгад, разгарнуўшы па цэхах сапраўднае спаборніцтва.

Трэба безадкладна расфармаваць аддзелы, «аддзельчыкі», сэктары і групы заводакіраўніцтва, рашуча перасунуўшы інжынэраў і тэхнікаў, эканамістаў і бухгальтароў у цэхі. Неабходна поўнасьцю перадаць цэхам справу тэхнічнага нармаваньня і тэхналёгічнага плянаваньня, пакінуўшы за заводакіраўніцтвам у гэтых галінах толькі мэтадалёгічны кантроль, кансультацыю і праверку.

Тады ня будзе больш казусаў, падобных таму, які быў расказан на той-жа канфэрэнцыі: сёньня плянавы аддзел спускае цэху адзін плян, на заўтра вытворча-тэхнічны аддзел шле ад свайго імя другі, а на пасьлязаўтра ў цэх прыбывае за подпісам дырэктара трэцяе, новае, таксама «абавязковае да няўхільнага выкананьня» заданьне.

Ня будзе і такога становішча, калі, напрыклад, стандартны цэх затаварэўся гатовымі дамамі, да якіх не хапае ўсяго адной дробязі: фортачак. Запамяталі пры палетальным ілжаваньні.

Бабруйскі камбінат, — да рэчы сказаць, самае вялікае ў Эўропе дрэваапрацоўчае прадпрыемства, пры такіх умовах пачне працаваць так, як належыць сацыялістычнаму гіганту.

На камбінаце ёсьць усё неабходнае для выкананьня пляну. Ёсьць людзі, гарача адданыя сацыялізму, паказаўшыя ня раз прыклады ўзорнай работы. Ёсьць надзейны касьцяк кадравых рабочых, ёсьць някепскія інжынэры і добрыя майстры. Ёсьць моцная партыйная арганізацыя, не мабілізаваная, аднак, сваімі «кіраўнікамі» на сапраўдную барацьбу за плян.

ДА ЗЬЛЁТУ ПЕРАДАВЫХ СЕЛЬСАВЕТАЎ БССР

З 20 ліпеня па Чашніцкім раёне праводзяцца пленумы сельсаветаў па падрыхтоўцы да ўсебеларускага зьлёту старшынь перадавых сельсаветаў.

На пленум выехалі прадстаўнікі РК КП(б)Б і РВК для правядзеньня масавай работы, арганізацыі дэпутацкіх груп і мабілізацыі калгасьнікаў на датэрміновую здачу сена дзяржаве.

Вязаўскі, Іваяаўскі і Чашніцкі сельсаветы ўключыліся ў спаборніцтва на лепшую арганізацыю ўборкі ўраджаю і здачы сельгаспрадуктаў дзяржаве.

(БЕЛТА).

На зьлёт—сапраўды перадавых

У Чырвона-Слабодзкім раёне шырока разгарнулася падрыхтоўчая работа да ўсебеларускага зьлёту старшынь перадавых сельсаветаў БССР.

На ўсіх сельсаветах праводзяцца пашыраныя пленумы з удзелам адказных прадстаўнікоў ад РК КП(б)Б і РВК. Пленумы праводзяцца пад пунктам погляду забесьпячэньня да пачатку зьлёту мабілізацыі калгасных і працоўных аднаасобных мас на пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі і збожжаздачы.

Разам з гэтым па ўсіх сельсаветах, калгасах і саўгасах праводзіцца масавая праверка арганізацыі аховы ўраджаю, арганізацыйна-масавай работы саветаў і яго нізавых зьвеньняў, секцый дэпутацкіх груп.

Задача праверкі—выявіць сапраўды перадавыя сельскія саветы, выкананьне імі абавязкаў, узятых на сябе па ўсесаюзным конкурсе на лепшы па рабоце сельсавет, секцыю, дэпутацкую групу, і забесьпячэньне пасьпяховага правядзеньня другога этапу конкурсу.

Скарыстаем адходы лясной прамысловасьці

Электрастанцыя дрэваапрацоўчага камбінату імя т. Пікало ў Нова-Беліцы цалкам працуе на ўласным апале. Для апалу ідуць шчэпы, апілкі, кара. Для падачы адходаў на электрастанцыю пабудаван спэцыяльны транспарцёр.

На здымку: транспарцёр, па якім адходы паступаюць да топак станцыі.

УСЕСАЮЗНЫ ДЗЕНЬ АВІЯЦЫІ

18-га жніўня — усесаюзны дзень авіяцыі і дзесяцігодзьдзе таварыства прыхільнікаў паветранага флёту. ЦС Асаавіяхіму БССР праводзіць рад мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да гэтага дня.

У аснову падрыхтоўчых работ кладзецца разгортваньне і разьвіцьцё авіяцыйнай справы ў БССР. На ўсіх буйнейшых прадпрыемствах арганізуюцца авіягурткі і авіякуткі.

У Менску 18 жніўня адбудзецца ўрачыстае адчыненьне ўсебеларускага авіяклюбу з філіяламі ў Гомелі, Віцебску, Бабруйску і Воршы. Адначасова ў Менску, Віцебску і Гомелі пачнуць працаваць новыя плянэрныя станцыі, ужо праводзіцца вярбоўка людзей з разьлікам ня менш 20 чалавек на адзін плянэр.

Авіягурткі (у Менску іх будзе арганізавана ня менш 10) ставяць сваёй мэтай надаць будучым аэракадрам адпаведную тэарэтычную падрыхтоўку пілёта і тэхнічныя веды матарыста. Уся гэта работа будзе праводзіцца ў цэнтральным аэраклюбе.

Для папулярызацыі працы і папаўненьня складу Віцебскай аэрашколы—18 жніўня арганізуюцца ўнутрышкольныя сацспаборніцтвы інструктароў на лепшую тэхніку пілётаваньня.

Сьвята будзе адзначана ўсебеларускай палітмасоўкай, прысьвечанай разьвіцьцю авіяцыі ў БССР.

Да гэтага дню мы павінны з посьпехам скончыць збор сродкаў на пабудову эскадрыльлі імя Кагановіча.

Рацыяналізацыя скарыстоўваньня матэр'ялаў

На здымку: мэханічная сшыўка абсацаў з абрэзкаў скур на фабр. «Труд» (Гомель). Скарыстоўваньне пры дапамозе спэцыяльных машын адходаў вытворчасьці дае фабрыцы да 10 тысяч руб. эканоміі.

29-га ліпеня менская гарадзкая канфэрэнцыя якасьці

Вузкае месца гарбарна-абутковай прамысловасьці Менску

Менская абутковая фабрыка імя Кагановіча ў першым квартале не дадала краіне абутку на 66 тыс. рублёў. Свой прамфінплян яна выканала толькі на 82 проц.

Такія вынікі работы фабрыкі ў галіне выкананьня колькасных паказальнікаў. Горшае становішча мы маем у галіне якасьці прадукцыі. Згодна пляну першы гатунак выпускаемага абутку павінен складаць ня менш 90 проц. Складае-ж ён у сярэднім 85 проц. Бываюць дні, калі з канвэеру сходзіць абутак першага гатунку ня больш 80 проц.

Астатні-ж мае вялікую колькасьць дэфэктаў (мяккія наскі, царапіны, прарывы падэшвы і інш.) і ідзе ў брак.

Характэрна, што за паўгода фабрыка ні ў адным месяцы не дала патрэбнай колькасьці абутку першага гатунку. Пры гэтым за апошнія тры месяцы мы маем яўнае пагаршэньне работы. Калі ў першым квартале першы гатунак складаў 82,5 проц. усёй выпушчанай прадукцыі, то ў другім—толькі 82 проц., а за паўгода ў цэлым 83,9 проц.

Да чаго прывяла ў канчатковым выніку такая работа? Па-першае, краіна не даатрымала тысячы добраякаснага абутку, а па-другое, сама фабрыка панесла вялікія страты. **За паўгода яна страціла на гатунковасьці 20 тыс. рублёў.**

Аднак, гэта далёка ня ўсё. Саюзскурзбыт з свайго боку дадаткова прадставіў фабрыцы рахунак на 33 тыс. рублёў. Справа ў тым, што пасьля таго, як абутак паступіў ужо на склады Саюзскурзбыт прымушан быў яго перасартоўваць. У выніку шмат абутку, які фабрыка лічыла першагатунковым, аказалася нядобраякасным.

Паўстае пытаньне. Чым-жа тлумачыцца такое становішча, дзе прычыны такой ганебнай работы? Кіраўнікі фабрыкі ўсю віну ўзвальваюць на сыр'ё.

— Мы ў якасьці дакладу ўжываем нядобраякасныя сурагаты, — заяўляюць яны,—нельга-ж з дрэннага зрабіць што-небудзь добрае!

У некаторай ступені яны маюць рацыю. Фабрыка сапраўды часамі атрымоўвае нядобраякасны сурагат і каб унікнуць вялікіх прастояў прымушана скарыстоўваць яго, што ня можа не адбівацца на якасьці абутку. Аднак асноўная прычына ня ў гэтым. Асноўную прычыну трэба шукаць у рабоце самой фабрыкі. Ў чым яна заключаецца? Вялікі процант браку даюць царапіны верху абутку. Бацінак як бацінак, а надзяваць яго на нагу немагчыма, бо верх быццам хто наўмысьля парэзаў. Хто вінаваты ў гэтым? Перш за ўсё—бракаробы, якія нядбайна адносяцца да нацяжкі бацінка на калодку і абрэзкі канта.

Шмат бацінак ідзе ў брак толькі таму, што пры зьняцьці з калодак робіцца вялікія прарывы падэшвы.

Вінаваты і майстры, якія нядбайна адносяцца да выкананьня сваіх абавязкаў. Замест таго, каб уваходзіць у сутнасьць кожнай дэталі работы рабочага, яны фармальна, па-казённаму адбываюць у цэху свой рабочы час. Запытае што-небудзь рабочы—майстра пакажа, не запытае—і вокам не гляне.

Тое самае можна сказаць і аб некаторых загадчыках цэхаў. Узяць хаця-б загадчыка другога пашывачнага цэху тав. Кроля. Замест таго, каб рашучым чынам выкрываць бракаробаў і змагацца з імі, ён стварае такія ўмовы, якія па сутнасьці спрыяюць павялічэньню браку. Для таго, каб ня кідалася ў вочы, што цэх дае шмат браку, Кроль парашыў «рацыяналізаваць» здачу прадукцыі. У дні, калі брак дасягае вялікага проценту, ён значную частку нядобраякаснага абутку затрымлівае ў цэху, а потым прасоўвае яго ў тыя дні, калі браку бывае менш.

Былы загадчык штамповачнага цэху Шчапкалін часта п'янстваваў з бракаробамі, пазычаў у іх грошы на гарэлку. Зразумела, што ён ня толькі ня вёў барацьбу з бракаробамі, а часта пакрываў іх.

Выпускаецца шмат браку і па віне лябараторыі фабрыкі, якая часта дае дрэнны стабелін для клейкі наскоў. У выніку наскі атрымоўваюцца вельмі мяккімі.

Ці можна пасьля ўсяго гэтага казаць, што асноўная прычына—у сыр'і? Заяўляць так — значыць шукаць «аб'ектыўных» прычын для апраўданьня сваёй бязьдзейнасьці, для прыкрыцьця ўсіх недахопаў, якія ёсьць на фабрыцы.

Некалькі слоў аб рабоце гарбарні «Бальшавік». Гэта прадпрыемства зьяўляецца адным з перадавых у лёгкай прамысловасьці БССР. Яно ўжо некалькі год падрад пасьпяхова выконвае свой прамфінплян па колькасных паказальніках. Лепш чым на іншых прадпрыемствах стаіць справа і ў галіне якасьці прадукцыі. Але сказаць, што на «Бальшавіку» ўсё абстаіць добра—значыць ня ведаць фактычнага становішча. Справа ў тым, што прадукцыя «Бальшавіка», асабліва — хром, які выпрацоўваецца з сьвіных скур, мае шмат дэфэктаў. Аб гэтым сьведчыць хаця-бы той факт, што нядаўна трыкутнік Ленінградзкай абутковай фабрыкі «Скараход» зьвярнуўся з лістом да ЦП саюзу скурнікаў, каб апошняе зьвярнула ўвагу прафарганізацыі гарбарні «Бальшавік» на палепшаньне якасьці выпускаемай прадукцыі.

Для таго, каб рашучым чынам ліквідаваць прычыны, якія ляжаць у аснове выпуску нядобраякаснай прадукцыі фабрыкай імя Кагановіча і гарбарняй «Бальшавік», Менскі гарком партыі разам з гарпрафсаветам і ЦП саюзу скурнікаў **29 ліпеня склікаюць агульна-гарадзкую канфэрэнцыю рабочых гэтых двух прадпрыемстваў.** Канфэрэнцыя павінна мабілізаваць увагу рабочых гарбарнікаў і абутнікаў на ўсямернае палепшаньне якасьці прадукцыі—асноўнай задачы першага году другой пяцігодкі.

Фралоў.

УБОРАЧНАЙ--УЗОРНАЯ СУВЯЗЬ

Сувязісты Дрысенскага раёну ўзялі на сябе рад абавязкаў па арганізацыі ўзорнай сувязі на палёх у часе ўборкі. Яны паставілі перад сабой задачу ахапіць усіх калгасьнікаў падпіскай на газэты, часопісі і без спазьненьня дастаўляць разам з лістамі і тэлеграмамі на месца. Для лепшай арганізацыі гэтай справы будзе арганізавана 75 кантрольных вучасткаў.

Адначасова сярэдняя хуткасьць адказу па тэлефону будзе даведзена да 5 секунд, час папраўкі псаваньняў з моманту заяўкі зьніжан на 15 мінут у калгасах, да 40 мінут на гарадзкіх цэпях і да 5 гадзін на прыгарадных і раённых цэпях. Час выпраўленьня псаваньняў радыёкропак будзе зьніжан да адной гадзіны, эфірных установак — да 8 гадзін.

На час уборачнай мяркуюць адкрыць 10 новых радыё-кропак і да кожнага апорнага прадпрыемства прымацаваць кваліфікаваных сувязістаў.

Сувязісты Дрысенскага раёну заклікаюць усіх сувязістаў БССР уключыцца ў найлепшае абслугоўваньне ўборачнай кампаніі.

Месячнік штурму бездарожжа

Раўняйцеся па Пухавіцкім раёне

Аб прэміяваньні перадавікоў дарбудаўніцтва

Пастанова цэнтральнай конкурснай камісіі

У дадатак да зьмяшчаных цэнтральным штабам 2.500 руб. для прэміяваньня перадавых калгасаў, саўгасаў, МТС і асобных таварышоў Пухавіцкага раёну, за сапраўды бальшавіцкую арганізацыю штурму дарожнага будаўніцтва, у выніку чаго раён на 10 ліпеня выканаў плян працаўдзелу насельніцтва на 108 проц., цэнтральная конкурсная камісія пастанаўляе:

прэміяваць старшыню Пухавіцкага РВК тав. **Ступакова** і сакратара РК КП(б)Б тав. **Тарасава** па 500 руб. кожнага;

загадчыка райдараддзелу тав. **Вінікава**—вэлёсыпэдам;

начальніка палітаддзелу Пухавіцкай МТС тав. **Клыса** і рэдактара райгазэты «За калгасы» тав. **Міхайлава**—па 200 руб. кожнага;

сакратара райсавету Аўтадору тав. **Крывіцкага** за забесьпячэньне сапраўднага ўдзелу аўтадораўскай арганізацыі ў дарожным будаўніцтве—100 руб.;

выдучыць у якасьці прэміі райдараддзелу—адзін нівэлір, гоніямэтр, 2 рэйкі і 2 істужкі. Даручыць райштабу ўсе матэр'ялы прэміяваньня лепшых ударнікаў дарожнага будаўніцтва прадставіць у цэнтральную конкурсную камісію не пазьней 1 жніўня.

Старшыня цэнтральнай конкурснай камісіі па дарбудаўніцтве ГОЛЬДШТЭЙН.

Сакратар ГОРДЗІН.

Чорная дошка

За ганебныя тэмпы дарожнага будаўніцтва заносім на чорную дошку наступныя раёны:

Чачэрскі выканаў плян працаўдзелу насельніцтва на 7,2 проц., **Веткаўскі**—8,4 проц., **Сіроцінскі**—11,6 проц., Шклоўскі—13,1 проц., **Рэчыцкі**—15,8 проц., **Ельскі**—17,1 проц., **Уваравіцкі**—17,3 проц., **Чэрыкаўскі**—17,5 проц., **Гомельскі**—20,2 проц., **Горацкі**—21,4 проц., **Церахаўскі**—21,7 проц., **Нараўлянскі**—22 проц., **Лепельскі**—24,1 проц., **Крычаўскі**—24,1 проц., **Чырвонапольскі**—24,2 проц.

Задача раённых арганізацый забясьпечыць у бліжэйшыя дні ўздым работы на дарожным будаўніцтве з тым, каб нагнаць прапушчанае і да першага жніўня поўнасьцю выканаць плян дарожных работ.

Усесаюзны агляд падрыхтоўкі да навучальнага году

Не дапусьціць зрыву будаўніцтва і рамонту школ!

Да пачатку навучальнага году трэба скончыць распачатае летась і ў папярэднія гады будаўніцтва 282 будынкаў для 4-х камплектных школ і 112 — для сямігодак. Гэтымі днямі сэкцыя культтрупы ЦКК НК РСІ склікала нараду з мэтай высьвятліць становішча з будаўніцтвам і рамонтам школ. Ня гледзячы на важнасьць пытаньня, на нарадзе адсутнічаў прадстаўнік Белдзяржснабу, які, да рэчы сказаць, зьяўляецца адным з вінаватых у марудных тэмпах і будаўніцтва і рамонту школ.

На нарадзе з усёй яскравасьцю выявілася, што калі ў бліжэйшыя-ж дні ня будзе зроблена рашучага пералому, дык ёсьць пагроза, што дырэктыва партыі і ўраду ў тэрмін ня будзе выканана — да новага навучальнага году большасьць школ застанецца недабудаванай і неадрамантаванай.

У чым прычыны прарыву ў будаўніцтвам і рамонтам? Прычыны гэтыя хаваюцца ў тым, што сэктар капітальных работ Дзяржпляну, будаўнічыя, раённыя арганізацыі і сельсаветы цэлага раду раёнаў проста ігнаруюць дырэктывы сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б, які прапанаваў на працягу 1933 году скончыць распачатае школьнае будаўніцтва.

Трэці квартал у будаўніцтве і рамонце школ зьяўляецца рашаючым, — да канца ліпеня трэба ў асноўным скончыць і будаўніцтва, і рамонт школ. На гэту мэту ў 3-м квартале неабходна 5.026 тыс. рублёў, Дзяржплян-жа адпускае толькі 293 тыс. руб. Яшчэ горш справа з водпускам такіх матэр'ялаў, як шкло і цьвікі. Наогул трэба сказаць, што на школьнае будаўніцтва ў 2-м квартале пакуль што Наркамасьветы не атрымала ніякіх матэр'ялаў.

Тут нельга ня спыніцца і на «мэтадах работы» сэктару капітальных работ Дзяржпляну пры вылічэньні водпуску шкла для школьнага будаўніцтва. Пры гэтым сэктар выходзіць не з сапраўдных патрэб у шкле, а з сум, адпушчаных сёлета на сканчэньне будаўніцтва. Напрыклад, школьны будынак у асноўным быў гатовы яшчэ летась, трэба толькі паставіць печы, скончыць дробныя сталярныя работы і цалкам ашкліць будынак. Зразумела на сканчэньне такіх работ у бюджэт уносілася патрэбная, але не вялікая сума. Дык вось сэктар капітальных работ Дзяржпляну мэханічна падзяліў адпушчаную суму на кошт кубамэтра і з гэтага разрахунку праектаваў водпуск шкла. У выніку такога «праектаваньня» па падліках Дзяржпляну трэба ўсяго 36 тыс. кв. мэтраў шкла, у той час, калі ў сапраўднасьці неабходна мінімум 74-75 тыс. кв. мэтраў. У выніку такога «плянаваньня» Дзяржплянам патрэбнасьць школ у шкле ў лепшым выпадку будзе забясьпечана толькі на 45-48 проц.

А як рэалізуюцца праекты Дзяржпляну? З 4 тыс. кв. мэтраў шкла, адпушчаных Дзяржплянам у першым квартале, Белдзяржснаб фактычна адпусьціў усяго 28 проц., у другім квартале з 12.800 кв. мэтраў — толькі 1.140 кв. мэтраў, што складае ня больш 8 проц. праектоўкі Дзяржпляну.

На сканчэньне будаўніцтва і рамонту школ у трэцім квартале патрэбна 125 тон цьвікоў, а Дзяржплян мяркуе адпусьціць толькі 8 тон.

Як-жа ідзе будаўніцтва школ на раёнах? Па-першае, трэба адзначыць, што ўсе заяўкі на лясны матэр'ял, на цэглу задаволены поўнасьцю ня толькі разнарадкамі, але і канкрэтна самымі матэр'яламі. Ня дрэнна стаіць справа з забесьпячэньнем вапны і іншым будаўнічым матэр'ялам. Усё гэта давала магчымасьць гарсаветам і раёнам праводзіць будаўніцтва баявымі тэмпамі. Мы можам прывесьці рад фактаў, калі асобныя раёны паказваюць сапраўдныя ўзоры барацьбы за выкананьне дырэктыў партыі і ўраду. Так, у **Вузьдзенскім раёне** ўсе 6 школ будуюцца і будуць гатовы да пачатку навучальнага году. За апошні час узмацніліся тэмпы будаўніцтва ў **Лагойскім раёне**, дзе з 4 школ тры будуць гатовы да пачатку заняткаў. Такі-ж малюнак і па некаторых іншых раёнах.

У гэты-ж самы час, пры тых-жа самых умовах, што і ў **Вузьдзенскім раёне, ў Крычаўскім раёне** з 4-х школ ніводная ня будуецца, — мясцовыя арганізацыі Крычаўшчыны скардзяцца на недахоп цьвікоў, а між тым у школах і сьцены ня выведзены (як вядома, на гэту работу цьвікі не патрэбны). На Ўваравіцкім раёне таксама не дабудоўваецца ніводнай школы, а Чабатовіцкая школа пачала ўжо гніць. Такое-ж становішча мы маем у Петрыкаўскім, Дубровенскім і Мазырскім раёнах. Віцебск мае ўсе магчымасьці выканаць дырэктывы партыі і ўраду ў тэрмін, але нават у самым горадзе не распачата пабудова 2 школ, не пачалі будаваць сямігодку.

Нядаўняя праверка Менскай гарККРСІ і друку выявіла, што будаўніцтва школ у прыгарадным раёне праходзіць яўна нездавальняюча. Прадстаўнік Менскага гарана тав. Шыпнеўскі замест таго, каб па-бальшавіцку ўказаць на прарывы ў будаўніцтве і на тое, што робіць гаран для іх ліквідацыі, на нарадзе палічыў за лепшае заняцца «очковтирательством». Цімошкаўская школа, — заявіў тав. Шыпнеўскі, скончана на 90 проц., а на справе аказваецца, што сьцены згнілі і няма фундаманту; у Каралішчавіцкім сельсавеце будаўніцтва скончана па словах Шыпнеўскага на 30 проц., аказваецца, што тут да сканчэньня будаўніцтва нават і не прыступалі.

Асабліва агідныя адносіны з боку Менгарана і Менбуду мы маем з будаўніцтвам Серабранскай ФЗС. Гэта школа пачала будавацца яшчэ ў 1929 годзе, з году ў год на яе будаўніцтва адпускаюцца сродкі, але дагэтуль няма ня толькі фундаманту, а нават невядома, дзе рыць катлаван. Стары прэкт недзе згубіўся. Менгарана падсунуў на зацьверджаньне праект Віцебскай школы. Калі гэта не ўдалася, то ў рэшце, ужо ў самы разгар будаўнічага сэзону быў заказан новы праект. Эскізны праект гатовы, але забылі аб такой «дробязі», як рабочыя чарцяжы, у выніку — невядома дзе рыць катлаван. Менбуд-жа замест дапамогі займаецца бюракратычнымі адгаворкамі, — «дадзеце рабочыя чарцяжы — пачну будаваць». У свой час Менбуд гаварыў: «дадзіце будматэр'яля — будзем будаваць баракі-інтэрнаты для студэнтаў». Вось ужо шмат часу прайшло, як Менбуд атрымаў ад НКА ўсе матэр'ялы, але будаваць баракаў не пачаў. Тое-ж самае паўтараецца із будаўніцтвам Серабранскай ФЗС, — бо стары праект Серабранскай школы згубіў ніхто іншы як Менбуд...

Мы яшчэ раз падкрэсьліваем, што становішча з будаўніцтвам і рамонтам школ больш чым пагражаючае. Прычыны хаваюцца ў тым, што райвыканкомы і сельсаветы па цэлым радзе раёнаў не займаюцца гэтым пытаньнем. Старшыня Пенчынскага сельсавету Краўчанка (Гомельшчына) так проста і заявіў — рамантаваць школ ня буду, бо РВК не адпусьціў матэр'ялаў і сродкаў. Між тым, сродкі ёсьць у бюджэце сельсавету, а матэр'ял для рамонту таксама ёсьць на месцы. Не мабілізаваны на дапамогу сельскай школе і шэфскія арганізацыі. Гамельская-ж будкантора—шэф Пенчынскай школы—па словах старшыні сельсавету заявіла, дадзіце карову, тады дапаможам рамантаваць школу. У гэтай-жа школе трэба зрабіць 17 вааконных рам і перамяніць 5-6 дошак у падлозе,—ўсё гэта шэф мог-бы даўно ўжо зрабіць.

На мясцох дагэтуль яшчэ ў цэлым радзе раёнаў нічога ня робіцца для мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, вопыт лепшых раёнаў будсэктар Наркамасьветы не пашырае на іншыя раёны.

Раённы і нізавы друк у большасьці стаіць з боку ад падрыхтоўкі да навучальнага году. Шэф школы—камсамол запамятаваў аб сваім шэфстве. Для гэтага досыць праглядзець камплект газэты **«Чырвоная Зьмена»**. Яна павінна была штодня апэратыўна змагацца за баявую сустрэчу навучальнага году, і ў першую чаргу—за стабільны падручнік і выкананьне плянаў будаўніцтва і рамонту школ, але ў «Чырвонай Зьмене» школа—забыты вучастак.

Так далей працягвацца ня можа. Трэба неадкладна пакласьці канец безадказнасьці і абыякавасьці, якая існуе ў справе будаўніцтва і рамонту школ. Мы маем усе магчымасьці даць школе да пачатку навучальнага году адрамантаваны будынак. Да 15 жніўня трэба ўвесьці ў строй усе 394 школы, будова якіх прадугледжана і плянам і бюджэтам. Дзяржплян і Белдзяржснаб абавязан выканаць дырэктывы партыі і ўраду, забясьпечыць школы матэр'яламі, а не паперкамі і абяцанкамі. Партыйныя арганізацыі і органы НК РСІ павінны ўзяць пад свой кантроль будаўніцтва і рамонт школ.

В. З-ў.

Ратуйся, хто можа, шэфы з Будканторы едуць!!!

(Амаль фота-здымак)

Домна-перадавік



На здымку: домна № 4 Рыкаўскага заводу (Данбас), выканаўшая за 29 дзён 112,5 проц. месячнага заданьня (8.886 тон чыгуну).

Аб чым гаворыць апошняя пяцідзёнка

Зводка ходу выданьня стабільных падручнікаў на 22-VII —33 г.

Павінна быць надрукавана 100 падручнікаў з тыражом 2.800 тыс. экзэмпляраў.

Здана ў друкарню 87 падручнікаў.

У Наркамасьветы на зацьвярджэньні — 9 падручнікаў.

У ДБВ — 3 падручнікі.

У аўтараў — 1 падручнік.

Вышла з друку 30 падручнікаў, з іх 23 беларускіх, 4 яўрэйскія, 2 польскія, 1 літоўскі з агульным тыражом **1.111.500** экзэмпляраў.

Атрыманы базай 23 падручнікі з 930.000 экзэмпляраў.

Адгружан у раён 21 падручнік тыражом у 745.500 экзэмпляраў.

Кантрольная лічба друкарні імя Сталіна 40.000 у дзень, выпушчана за 21/VII — 33 г. 35.300 падручнікаў.

Па Палесдруку — кантрольная лічба штодзённага выпуску 10.000 тыс. у дзень, выпушчана на 19, 20, 21 ліпеня 30 тыс. экзэмпляраў.

Загадчык вучпэдсэктару ДВБ М. ДУБРАВІЦКІ.

* *

За апошнюю пяцідзёнку здан у друк усяго 1 падручнік. Лічба «9» незацьверджаных у Наркамасьветы падручнікаў СТАБІЛЬНАЯ ЛІЧБА. Ні кроку наперад. Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі таксама на працягу 5-дзёнкі здало ў друк усяго 2 падручнікі.

На працягу апошняй пяцідзёнкі **НІВОДНАГА ПАДРУЧНІКА НОВАЙ НАЗВЫ НЯ БЫЛО ЗДАНА НА БАЗУ.** Па-ранейшаму вялікія прарывы ў друкарні імя Сталіна, якая з дня ў дзень упарта ня выконвае кантрольную лічбу штодзённага выпуску падручнікаў.

За апошнія часы друкарня Акадэміі навук пашла насустрач выпуску стабільных падручнікаў. Яна ўзяла ў набор адзін польскі падручнік, абяцаючы яго выпусьціць да 15-VIII. За апошні час Паласдрук пачаў выконваць заданьне 10 тыс. у дзень, аб чым гаворыць апошнія тры дні (выканана 30 тыс.). У Маскве таксама друкуюцца 4 беларускія падручнікі. Усё гэта бязумоўна значна пасуне наперад справу. Але гэта ні ў якім разе не апраўдвае марудных тэмпаў выпуску падручнікаў, якія мы маем па сёнешні дзень у друкарні імя Сталіна. Настроям «апраўданьня» мы павінны даць самы рашучы адпор.

База кнігасэктару ДВБ яшчэ не пераключылася на бальшавіцкія тэмпы работы. Замест кантрольнай лічбы адгрузкі 60 тыс. падручнікаў у дзень, учора адгружана толькі 36 тыс. падручнікаў. І па сёнешні дзень з 70 тыс. падручнікаў 256 скрынак замарынаваліся на базе ва ўпакоўцы, што зрывае адгрузку.

Белпаперзбыт ня прымае ніякіх захадаў да забесьпячэньня паперай і кардонам.

Наркамасьветы па сёнешні дзень зрывае выкананьне праграм першага і другога канцэнтру. Замест 10-VII—тэрміну здачы праграм—НКА адцягвае гэты тэрмін. Між тым праграма павінна друкавацца ў Магілеве.

Маргарынаваму заводу—уласную сырцовую базу

Маргарынавы завод гомельскага тлукамбінату, пушчаны ў чэрвені мінулага году, поўнасьцю асвоіў тэхналёгічны працэс вытворчасьці, перавысіўшы праектную магутнасьць абсталяваньня. Ён выпускае да 20 тон прадукцыі ў зьмену, замест 10 тон, прадугледжаных праектам. Якасьць маргарыну адпавядае стандарту.

Побач з асноўнай прадукцыяй—маргарынам — завод арганізаваў выпрацоўку новага харчовага прадукту «кампаунд-жыру». Выпуск гэтага новага прадукту арганізаваны без дадатковых затрат, шляхам лепшага выкарыстаньня абсталяваньня і правядзеньня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

Ня гледзячы на поўную магчымасьць разгарнуць вытворчасьць, завод на працягу ўсяго году працуе з вялікімі перабоямі з-за незабясьпечанасьці сырцом — соламасам. За пяць месяцаў праграма выканана ўсяго на 63,6 проц.

Пытаньне аб становішчы на гомельскім маргарынавым заводзе абгаварвалася на адным з апошніх пасяджэньняў СНК БССР, які вызначыў рад практычных мерапрыемстваў па палепшэньні работы заводу.

Перад адпаведнымі саюзнымі арганізацыямі пастаўлена пытаньне аб уключэньні заводу ў кантыгент снабжэньня на трэці квартал.

СНК завастрыў увагу Наркамзему БССР на неабходнасьць разгарнуць работу па разьвядзеньні ў БССР пасеваў гарчыцы з такім разьлікам, каб гэтым самым ужо ў бліжэйшыя гады стварыць для заводу ўласную сырцовую базу.

У ашчадкасе пры Брылеўскім заводзе арудавалі жулікі

У Гомельскай ашчадкасе № 155 пры Брылеўскім заводзе ў якасьці касіра працаваў Шульменка, які раскрадваў і растрачваў вялікія сумы дзяржаўных сродкаў. Рабіў ён гэта вельмі проста. Для прыкладу можна прывесьці такі факт. Былы касір Левапчук перадаў Шульменку касу і сьпіскі людзей, якія ўнесьлі ўзнос па пазыцы без усякіх актаў. Гэта дало магчымасьць Шульменку, як новаму касіру, схаваць два сьпіскі і прысвоіць сабе 4 тыс. рублёў.

А вось другі, яшчэ больш цікавы факт. Бухгалтар атрымаў у банку 1.400 рублёў і перадаў іх Шульменку пад расьпіску. Апошні, пры дапамозе сакратара камсамольскага калектыву, ухітрыўся ўкрасьці сваю расьпіску і замест яе падсунуць расьпіску дырэктара заводу. У Шульменкі многа розных, на ўсякі выпадак, фіктыўных расьпісак, ёсьць нават расьпіскі людзей, усім не працуючых на заводзе.

Такой тактыкі Шульменка прытрымліваецца даўно. Раней ён працаваў ў Даўгалеўскай ашчадкасе, а пасьля на пошце. Там ён таксама падрабляў расьпіскі і выдаваў рабочым на рукі адну суму, а ў ведамасьцях запісваў другую. Усе гэтыя факты добра ведаў інспэктар 31 ашчадкасы Дубель, але пры расьсьледаваньні ён гэта чамусьці змазаў. Скаргі рабочых на Шульменку каля 3-х месяцаў марынуюцца ў гэтай касе.

Зараз аб усіх гэтых злачынствах адміністрацыя заводу паведаміла крымвышук, але інспэктар Браун ня прыняў неабходных мер. Грамадзкія арганізацыі заводу зацікавіліся гэтай справай толькі пасьля ўмяшацельства АДПУ.

Грамадзкасьць Гомелю патрабуе самых суровых мер пакараньня злачынца, які раскрадаў дзяржаўныя сродкі і дзейнічаў за адно з клясавымі ворагамі. Пракуратура павінна неадкладна заняцца гэтай справай. Усім ашчадкасам трэба зрабіць з гэтага адпаведныя вывады, бо шмат дзе кантроль яшчэ не на належнай вышыні і няма сапраўднай барацьбы за рацыянальнае скарыстаньне кожнай дзяржаўнай капейкі.

Вальнскі.

Аб ходзе праполкі і ворыва папараў і аб арганізацыі ўборкі па саўгасах менскага сьвінаводтрэсту, малочна-прамысловага трэсту і белільнанасенаводтрэсту

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ БССР

На падставе матэр'ялаў абсьледваньня і даных нарады, праведзенай пры ЦКК РСІ, прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК РСІ Беларусі адзначаюць, што ў саўгасах менскага Малпрамтрэсту, Менсьвінаводтрэсту і Белнасенаводтрэсту выкананьне пляну праполкі пасеваў фактычна сарвана, ворыва папараў і арганізацыя ўборачных работ праводзяцца выключна дрэнна.

Дырэктары трэстаў т. т. Аўчыньнікаў, Андрэенка і Сьцяпанаў не прынялі неабходных мер для таго, каб па-бальшавіцку арганізаваць баявую гаспадарча-палітычную кампанію і зламаць сабатаж паасобных работнікаў трэстаў і саўгасаў (Літвіненка, Бакіноўскі — Насентрэст, Вяроўкіна — Сьвінаводтрэст, Курпан — Малпрамтрэст).

а) На 1-VII па саўгасах гэтых трэстаў праполата 16-35 проц. пляну па ўсіх культурах.

Саўгасы Скрыгалава, Межава — Белнасентрэст, Палеснюм і «1-га мая» — Менсьвінаводтрэсту да праполкі зусім ня прыступілі.

б) Узьдым папараў да ўстаноўленага ЦК і СНК тэрміну ні адным трэстам ня выканан. На 1-VII па Менмалпрамтрэсту выканана 36 проц. пляну, Менсьвінаводтрэсту — 50 проц. і Белнасентрэсту — 68 проц.

в) Арганізацыя падрыхтоўкі і самы ход сенаўборкі не забясьпечвае сканчэньня гэтай работы да пачатку збожжаўборкі. Калі скошана па саўгасах гэтых трэстаў 10-12 проц. пляну, дык убрана толькі 1,5—4,5 проц.

Для своечасовага выкананьня пляну праполачных работ і сенаўборкі па саўгасах Менмалпрамтрэсту не хапае 8.140 чал., па саўгасах Менсьвінаводтрэсту—1.700 чал. Аднак, трэсты ня прынялі ніякіх рэальных мер да вярбоўкі рабочай сілы.

г) Рамонт трактараў і ўборачных машын да гэтага часу ня скончан. Па Малпрамтрэсту адрамантавана 40 проц. трактараў, па Белнасентрэсту — 80 проц. Па Менскім-жа Сьвінаводтрэсту — рамонт трактараў сарван, бо на 1-VII з 121 трактара было адрамантавана толькі 9 проц. Запаснымі часткамі саўгасы не забясьпечаны і якасьць рамонту як трактарнага парку, так і ўборачных машын трэстамі не правяралася.

Аб падрыхтоўцы коньскай цяглавай сілы і транспартных сродкаў саўгасаў трэсты ня маюць належнага ўяўленьня.

д) Кадры кваліфікаваных рабочых для работы на складаных уборачных машынах не падрыхтаваны. Так, па Сьвінаводтрэсту не прапушчана праз курсы ні аднаго чалавека тады, як патрэбнасьць яго складае 425 чал.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб палітычнай сьлепаце і злачынна-нядбайных адносінах да правядзеньня праполкі і ворыва папараў і ўборкі з боку дырэктараў трэстаў і значнай часткі дырэктараў саўгасаў.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК РСІ Беларусі пастанаўляюць:

1. Былога адказнага выканаўца па снабжэньні Насентрэсту Літвіненка за сабатаж справы снабжэньня саўгасаў уборачнымі машынамі і запаснымі часткамі, які праявіўся ў нескладаньні пляну і непрадстаўленьні разнарадак Сельгасснабу, у выніку чаго саўгасы не атрымалі вызначаных для іх 24 жняярак, 4 снопавязалак, 8 конных грабель — аддаць пад суд і прапанаваць упаўнаважанаму Саюзнасенаводу т. Мартансону зьняць яго з работы ў Хойніцкай канторы Саюзнасенаводу.

2. Адказнага выканаўцу па снабжэньні Насентрэсту т. Бакіноўскага за абсалютнае няведаньне становішча са снабжэньнем саўгасаў запаснымі часткамі, дробным інвэнтаром, за зрыў гэтай работы — з працы зьняць і аддаць пад суд.

3. Адказнага выканаўцу па арганізацыі працы ў саўгасах т. Курпан (Малпрамтрэст) за бязьдзейнасьць у справе вярбоўкі рабочай сілы — з працы зьняць.

4. Нам. дырэктара Малпрамтрэсту т. Казырэўскаму за праяўлены бюракратызм у складаньні і даводзеньні пляну па праполцы — даў саўгасам праполачныя пляны ў трубку, а пляны даслаў пасьля заканчэньня іх — за непрыняцьце мер да своечасовага складаньня пляну снабжэньня саўгасаў запаснымі часткамі, вынікам чаго зьяўляецца зрыў рамонту, за прымірэнчаства да сабатуючых дзяржаўныя мерапрыемствы супрацоўнікаў трэсту (Курпан) — абвясьціць суровую вымову.

5. Адказнага выканаўцу па рамонту трактараў т. Вяроўкіну (Сьвінаводтрэст), атрымаўшую спаганьне ад ЦКК-РСІ за нядбайныя адносіны да справы па рамонту трактараў да пасеўнай кампаніі, за бязьдзейнасьць у справе зрыву рамонту да ўборачнай — з працы зьняць.

6. Дырэктару Сьвінаводтрэсту тав. Аўчыньнікаву за няпрыняцьце мер да своечасовага складаньня пляну па праполачнай кампаніі, што прывяло да зрыву гэтых работ, за зрыў рамонту трактараў у саўгасах трэсту, за лібэральныя адносіны да адказнага выканаўцы па рамонту Вяроўкінай, няпрынятыя мер да арганізацыі рамонту — абвясьціць вымову.

7. Дырэктару Белнасентрэсту т. Андрэенку за палітычную сьлепату, якая праявілася ў тым, што ён дапусьціў прабываньне на рабоце ў трэсьце антысавецкага, сацыяльна-чужога чалавека, сарваўшага снабжэньне саўгасаў да ўборачнай кампаніі (Літвіненка), за прымірэнчыя адносіны да Бакіноўскага, які сарваў снабжэньне саўгасаў запаснымі часткамі і дробным інвэнтаром і за непрыняцьце мер да арганізацыі праполачных работ — абвясьціць вымову.

8. Прапанаваць тав. Андрэенку і Аўчыньнікаву ў двухдзённы тэрмін выслаць у саўгасы Метава, Скрыгалава (Насентрэст), Палеснюм і 1-га мая (Сьвінаводтрэст) адказных работнікаў у якасьці ўпаўнаважаных трэсту для арганізацыі работы ў гэтых саўгасах.

9. Абавязаць т. Сьмірнова (упаўнаркамсаўгасаў) прыняць рашучыя меры супроць вузка-ведамасьцьвенага, дзялядкага падыходу да рамонту трактараў у машына-трактарнай майстэрні Малпрамтрэсту, які праяўляецца ў першачарговым рамонце сваіх трактараў, і забясьпечыць рамонт трактараў Сьвінаводтрэсту, у якім стварылася найбольшая небясьпека зрыву рамонту.

10. Прапанаваць т. Вімбаду забясьпечыць снабжэньне запаснымі часткамі бесьперабойны рамонт трактараў Сьвінаводтрэсту.

11. Абавязаць начальнікаў палітаддзелаў і сакратароў партячэек перакінуць камуністаў з кіруючых пасад і другарадных работ у саўгасах у палявыя брыгады, вызначыць у кожнай брыгадзе партарганізатара, ускладаючы на яго адказнасьць за выкананьне вытворчага заданьня брыгады.

12. Абавязаць т. Аўчыньнікава, тав. Сьцяпанава і Андрэенку ў двухдзённы тэрмін выслаць у саўгасы ня менш як па 10 адказных работнікаў трэстаў для дапамогі дырэктарам саўгасаў у ліквідацыі прарыву ў праполачных работах, сенаўборцы, і арганізацыі ўборкі і абмалоце збожжавых культур, тэрмінам на адзін месяц.

За старшыню ЦКК КП(б)Б — нам. наркома РСІ БССР КОНІК.

Заключнае пасяджэньне эканамічнай канфэрэнцыі

Лёнданская эканамічная канфэрэнцыя бясслаўна скончылася. Капіталістычныя дзяржавы імкнуцца затушаваць ганебны правал «аб'ектыўнымі» недарэчнасьцямі.

Мал. Вал. Мядзьведзева.

У фашысцкай Германіі

Замежным адвакатам адмоўлена ў абароне нямецкіх камуністаў

ПАРЫЖ, 21 (Белта). Германскі вярхоўны суд адказаў адмаўленьнем на зварот французскіх прысяжных павераных, якія заявілі аб сваёй гатоўнасьці абараняць камуністаў **Торглера, Дзьмітрава, Папова і Танева**, якія абвінавачваюцца ў тым, што яны нібыта арганізавалі падпал рэйхстагу. Адмаўленьне «матывавана» тым, што абвінавачаныя павінны знайсьці сабе абаронцаў сярод германскіх прысяжных павераных. Германскія фашысты не дапускаюць да абароны Торглера, Дзьмітрава, Танева і Папова ня толькі замежных, але і германскіх адвакатаў. Як вядома, германскія адвакаты, якія адважыліся ўзяць на сябе абарону камуністаў, знаходзяцца пад пагрозай арышту.

**

БЭРЛІН, 21 (Белта). У Лейпцыгу апублікавана афіцыяльнае паведамленьне аб сканчэньні папярэдняга сьледзтва па справе аб падпале рэйхстагу. У паведамленьні ўказваецца, што «працэс, магчыма, зможа пачацца ў першай палове верасьня».

Новы козыр за стварэньне паветранага флёту

БЭРЛІН, 21. (Белта). Германскі друк для сваёй прапаганды за стварэньне германскага ваеннага паветранага флёту знайшоў новы козыр. «ДЭЙЧЭ АЛЬГЕМАЙНЕ ЦЭЙТУНГ» раптам высунула тэзіс «неабароненасьці Англіі ад паветраных нападаў». У артыкуле свайго лёнданскага карэспандэнта газэта, прыводзячы параўнаньне паміж паветранымі флётамі Англіі, ПАЗШ, Японіі і Францыі, прыходзіць да вываду, што ангельскі паветраны флёт слабей паветраных флётаў іншых дзяржаў. Гэта, паводле слоў газэты, робіць Англію «безабароннай» супроць паветраных нападаў, і таму яна павінна прызнаць «выгаднасьць для яе стварэньня германскага паветранага флёту». Паводле слоў карэспандэнта, у ангельскіх авіяцыйных колах многія віталі-б стварэньне германскага паветранага флёту, «каб тым самым прыкаваць да кантынэнта частку французскіх паветраных сіл».

Рост беспрацоў'я ў Германіі

БЭРЛІН, 21 (БЕЛТА). Паводле даных афіцыяльнай статыстыкі нацыянал-сацыялісцкага «РАБОЧАГА ФРОНТУ», у маі гэтага году беспрацоўе сярод членаў прафсаюзаў складала 44,7 ПРОЦ. усіх членаў прафсаюзаў, супроць 43,3 ПРОЦ. У МАІ 1932 г. Аб тым, што нацыянал-сацыялісты, ня гледзячы на свае абяцаньні і дэмагагічныя заявы, зусім ня здольны зьменшыць беспрацоўе, сьведчыць той факт, што фашысцкія газэты вымушаны рэкламаваць як «вялікія дасягненьні» адзінкавыя, дробныя факты прыёму на работу паасобнымі прадпрыемствамі некалькіх новых рабочых, зусім замоўчваючы масавыя звальненьні рабочых.

Яркі малюнак узрастаючай галечы працоўных мас Германіі даюць лічбы, апублікаваныя ў бюлетэні германскага статыстычнага кіраўніцтва «Віршафт унд статыстык» аб працягваючымся падзеньні нараджальнасьці ў вялікіх германскіх гарадох і аб павялічэньні сьмяротнасьці. З студзеня па красавік нараджальнасьць упала да 11,1 на тысячу гарадзкіх жыхароў, супроць 11,5 на той-жа пэрыяд мінулага году. Колькасьць сьмяротных выпадкаў узрасла за гэты пэрыяд 1933 г. да 12,6 на тысячу, супроць 11,1 у мінулым годзе. Статыстыка сьмяротных выпадкаў паказвае рост працэнту сьмяротнасьці ад сухот і запаленьня лёгкіх, г. зн. ад хвароб, якія ўзьнікаюць на глебе зьнясіленьня. Так, колькасьць сьмяротных выпадкаў ад сухот вырасла з 0,82 на тысячу ў першым квартале 1932 г. да 0,86 на тысячу на гэты-ж пэрыяд 1933 г. Колькасьць сьмяротных выпадкаў ад запаленьня лёгкіх павялічылася з 0,91 на тысячу да 1,3 на тысячу ў гэтым годзе.

ГУТАРКА ГЕНДЭРСОНА З ГІТЛЕРАМ

БЭРЛІН, 20 (Белта). Учора ўвечары ў Мюнхен з Прагі прыбыў старшыня канфэрэнцыі па разбраеньні Гендэрсон. Гендэрсон меў з Гітлерам гутарку, якая працягвалася гадзіну. У гутарцы прыняў таксама ўдзел міністар замежных спраў Нейрат. Агенцтва Вольф паведамляе, што ў гутарках Гендэрсона з Гітлерам у Бэрліне і Мюнхене быў падрабязна прыведзен пункт погляду германскага ўраду па пытаньні аб разбраеньні. **Гендэрсон пры гэтым заявіў, што ён лічыць пажаданай сустрэчу Гітлера з Даляд'е.** Аднак, у Германіі, паводле слоў агенцтва, лічаць, што для гэтага неабходна далейшая дыплёматычная падрыхтоўка.

Ад народнага камісарыяту па замежных справах

МАСКВА, 22. (Белта). 22-га ліпеня фінляндзкі пасланьнік у Маскве барон **Ір'е Коскінэн уручыў** па даручэньні свайго ўраду Ч.В.А. народнага камісара па замежных справах тав. **Н. Н. Крэсьцінскаму дэклярацыю аб** далучэньні Фінляндыі да канвэнцыі аб азначэньні агрэсіі, падпісанай 3-га ліпеня ў Лёндане — СССР, Эстоніяй, Латвіяй, Польшчай, Румыніяй, Турцыяй, Пэрсіяй і Аўганістанам.

Аб уручэньні дэклярацыі быў складзен пратакол, падпісаны тав. Н. Н. Крэсьцінскім і баронам Ір'е Коскінэн.

ЯПОНСКІ ДРУК АБ ТАКІЙСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

ТОКІО, 20 (Белта). Пасьля таго, як уся японская прэса аднадушна адзначыла, што савецкая дэлегацыя дабіваецца паскарэньня і пасьпяховага завяршэньня перагавораў аб КУЧ, газэта «Ніці-Ніці» 19-га і 20-га ліпеня апублікавала 2 інсьпіраваныя артыкулы, у якіх «абвінавачвае» савецкую дэлегацыю ў імкненьні «зацягнуць канфэрэнцыю».

Газэта сьцьвярджае, што савецкая дэлегацыя, згодна новым інструкцыям свайго ўраду, зварачаецца да «тактыкі зацягваньня перагавораў, каб палепшыць пазыцыю СССР на канфэрэнцыі».

Аднак, сьледам за гэтым газэта робіць прызнаньні, якія раскрываюць сапраўдны сэнс артыкулаў, а імення, што «у японскім міністэрстве замежных спраў лічаць, што лепшай палітыкай з боку Японіі будзе не сьпяшацца з канфэрэнцыяй і што манчжурскі бок таксама не пярэчыць супроць зацягваньня перагавораў». Газэта дадае, што паводле вестак, якія ў яе ёсьць, «ваеннае міністэрства і міністэрства замежных спраў аднадушна парашылі пайсьці на доўгія перагаворы, калі СССР не праявіць шчырасьці».

У другім артыкуле, разьвіваючы і ўдакладняючы пазыцыю японскага і манчжурскага бакоў, газэта сьцьвярджае, што «канфэрэнцыя вельмі зацягнецца, і Японія і Манчжоу-Го парашылі «не сьпяшацца з перагаворамі».

Паведамляючы аб наведваньнях тав. Юрэневым 17 і 19 ліпеня міністра замежных спраў Уцыда і тав. міністра Сігеміцу, у часе якіх кіраўнік савецкай дэлегацыі зьвярнуўся да японскага міністэрства замежных спраў з прапановаю садзейнічаць паскарэньню перагавораў,—газэта сьцьвярджае, што японскія і манчжурскія ўлады парашылі застацца на ранейшай пазыцыі і кіравацца тым меркаваньнем, «што яны не павінны фарсаваць сканчэньня перагавораў, а наадварот, старацца дабівацца ўзаемнай згоды павольна, але верна».

Спроба ўнікнуць надыходзячага краху

Н'Ю-ЁРК, 21 (Белта). Катастрофы на біржах і рост забастовачнага руху па ўсёй краіне прымусілі ўрад у сьпешным парадку высунуць новы праект, а імення: аб «дабраахвотных індывідуальных згодах» на паасобных прадпрыемствах. Праект прыведзен у спэцыяльнай адозве. Асноўная думка адозвы зводзіцца да неабходнасьці ўнікаць прамысловых канфліктаў. Інакш кажучы, падрыхтоўваецца глеба для шырокай кампаніі за прыдушэньне забастовак і разгром рэвалюцыйных прафсаюзаў.

Гэты факт урад стараецца замаскаваць дэмагагічнымі посуламі і гучнымі фразамі.

Так, у адозве прапануецца, каб прадпрыемцы падпісалі індывідуальныя згоды, у якіх быў-бы ўстаноўлен мінімум зарплаты для прамысловых рабочых. Аднак, паколькі дарагоўля ўсё ўзрастае, рэальная вартасьць такога мінімуму фактычна будзе зьніжацца з кожным днём. Пры гэтым прадугледжваецца рад выключэньняў, якія фактычна даюць магчымасьць не захоўваць нават гэтага мінімуму. Вельмі важна таксама, што індывідуальныя згоды ня ўносяць ніякіх абмежаваньняў ва ўжываньне патагонскай сыстэмы працы. Прадпрыемцы, падпісаўшыя згоду, павінны абяцаць павышаць цэны «толькі ў выпадку неабходнасьці», «устрымлівацца ад спажывы» і г. д.

Ня цяжка заўважыць, што такога роду «абавязацельствы» вельмі туманны і неакрэсьлены. Увесь праект па сутнасьці адзначае спробу перамагчы надыходзячы крах за кошт рабочых. Прадпрыемцам-жа ня прыходзіцца непакоіцца сьцясьненьняў, хоць адозва ня скупіцца на папяровыя пагрозы па іх адрасе. Насельніцтву адозва прапануе аказваць падтрыманьне прадпрыемцам і рабочым, падпісаўшым індывідуальныя згоды і байкатаваць тых, хто ўхіліўся ад гэтых згод. У адозве зьмяшчаецца шмат фраз, якія ўяўна сьведчаць аб вялікім замяшаньні. Так, у ім гаворыцца, што праблему беспрацоўя можна вырашыць на працягу 6 тыдняў, але «для гэтага патрабуецца, каб краіна дзейнічала хутка і сьмела».

„Уся Амэрыка ў становішчы найвялікшага ўзбуджэньня і замяшаньня“

БЭРЛІН, 21. (Белта). Апошняе паведамленьне аб падзеньні курсу акцый на Н'ю-ёркскай біржы і аб біржавой паніцы, якая там пачалася, зрабілі тут вялікае ўражаньне. «Тэмпо» піша «аб новым чорным дні на Уолстрыце (вуліца банкаў у Н'ю-Ёрку) і аб сучасным «абвале курсаў акцый на учарашняй біржы».

Уся Амэрыка, — паведамляе н'ю-ёркскі карэспандэнт «Бэрлінэр Бэрзэн Кур'ер, — знаходзіцца ў становішчы найвялікшага ўзбуджэньня і замяшаньня. Карэспандэнт лічыць, што новы біржавы крах зьяўляецца рэзультатам неабгрунтаванага і спэкуляцыйнага павышэньня курсаў акцый на біржы за апошні час, бо «пакупальная здольнасьць не павялічылася, а цэны ў той-жа час расьлі».

«Фосішэ цэйтунг» у перадавым артыкуле таксама падкрэсьлівае, што падзеньне акцый на Н'ю-ёркскай біржы зьяўляецца рэакцыяй на рост цэн і курсаў, які ня быў выклікан эканамічным жыцьцём, а меў чыста спэкуляцыйны характар.

Н'ю-ёркскі карэспандэнт «Дэйчэ альгемэйнэ цэйтунг» адзначае, што, ня гледзячы на ўсе намаганьні ўраду аслабіць крызіс, усё часьцей раздаюцца пэсымістычныя галасы.

**

Н'Ю-ЁРК, 21. (БЕЛТА). Сёньня на Н'ю-Ёркскай біржы адбылося новае рэзкае падзеньне курсаў акцый, выклікаўшае паніку, якой ня было з 1929 году. У гэты дзень біржавы абарот АХАПІЎ 9 З ПАЛОВАЙ МЛН. АКЦЫЙ. Носяцца чуткі аб маючым быць закрыцьці біржы. У апошнія мінуты наглядалася некаторае паляпшэньне курсаў. На таварнай біржы цана бавоўны пала НА 6 ДАЛЯРАЎ З КІПЫ, хоць пазьней крыху павысілася. ПАЛІ ЦЭНЫ НА МАСЛА, ЦУКАР, ЯЙКІ і іншыя тавары. ЗАКРЫЛІСЯ ХЛЕБНЫЯ БІРЖЫ Ў ЧЫКАГА І ІНШЫХ ГАРАДОХ. На Н'ю-Ёркскай хлебнай біржы пануе паніка і замяшаньне.

Савецкія лётчыкі выляцелі ў Маскву

ВАРШАВА, 22 (Белта). Учора савецкія лётчыкі **Ігнауніс і Туржанскі** вярнуліся з Кракава ў Варшаву. Учора-ж яны прысутнічалі на прыёме, наладжаным савецкім паўпрэдзтвам для прадстаўнікоў польскай грамадзянскай і ваеннай авіяцыі. Увечары ў той-жа дзень дырэктарам таварыства грамадзянскай авіяцыі Філіповічам у гонар савецкіх лётчыкаў быў дан абед. За абедам Філіповіч і Ігнауніс абмяняліся прыяцельскімі прамовамі.

Сёньня ў 8 гадз. 30 мін. па варшаўскаму часу савецкія лётчыкі выляцелі ў Маскву. На аэрадроме лётчыкаў праважалі прадстаўнікі паўпрэдзтва СССР на чале з т. Антонавым-Аўсеенкам, увесь афіцэрскі склад павятраплаваньня, чыны ваеннага міністэрства на чале з палкоўнікам **Райскім**, дырэктар таварыства грамадзянскай авіяцыі палкоўнік **Філіповіч**, прадстаўнікі міністэрства замежных спраў і польскага авія-клюба. Пасьля цёплага разьвітаньня першым падняўся **Туржанскі, маршрут якога ляжыць праз Брэст. Праз некалькі мінут падняўся другі аэраплян з пілотам Ігнаунісам. Маршрут Ігнауніса—Ліда—Віцебск.**

ПОЛЬСКІ ДРУК АБ УЗБРАЕНЬНІ ГЕРМАНІІ

ВАРШАВА, 21. (Белта). У сувязі з паездкай Гендэрсона ў Германію польскі друк аддае шмат увагі росту ўзбраеньняў Германіі. «Кур'ер Поранны» паведамляе, што 21 ліпеня праводзіцца ў Германіі трохдзенная мабілізацыя легкавых аўтамабіляў, з мэтаю спробнай перакідкі 60 тыс. штурмавікоў. Газэта пацьвярджае паведамленьне «Дэйлі Тэлеграф» аб тым, што германскі генэральны штаб занят круглыя суткі правядзеньнем пляну павялічэньня германскіх узбраеньняў. Спасылаючыся на галандскія крыніцы, газэта канстатуе, што на галяндзкай граніцы з Германіяй вырасла цэлая сетка фабрык і арсеналаў, якія снабжаюць Германію ўзбраеньнем. Жалезная руда і медзь увозіцца ў Германію ў такой колькасьці, якая знаходзіцца ў простай супярэчнасьці з агульным цяжкім эканамічным становішчам краіны і тлумачыцца выключна ліхаманкавай работай цяжкай прамысловасьці, нагружанай ваеннымі заказамі. Побач з ростам імпарту жалезнай руды, адзначаецца, паводле слоў газэты, таксама рост імпарту сыравіны, прызначанай для германскіх хэмічных фабрык для вырабу ўдушлівых газаў.

Палітычная паліцыя германскага пасольства ў Парыжы

ПАРЫЖ, 21 (Белта). Саарбрукенская сацыял-дэмакратычная «Фольк-штымэ» паведамляе, што да германскага пасольства ў Парыжы прыкамандзіравана **40 чыноўнікаў, якія на справе зьяўляюцца палітычнай паліцыяй, якая ўзначальваецца Герынгам** (як паведамлялася некалькі тыдняў таму назад загранічныя агентуры гэтай паліцыі заснаваны ў розных краінах).

Сьмертныя прыгаворы і катаржныя прысуды над германскімі рабочымі

БЭРЛІН, 22. (БЕЛТА). ГАМБУРГСКІ надзвычайны суд вынес прыгавор па СПРАВЕ 17 КАМУНІСТЫЧНЫХ РАБОЧЫХ, абвінавачаных ва ўдзеле ў сутычках з нацыянал-сацыялістамі, пры якіх быў забіт адзін паліцэйскі. РАБОЧЫ ФАЛЬК прыгаворан да кары сьмерцю. Другі падсудны прыгаворан ДА 15 ГОД КАТАРГІ, трое падсудных — ДА 10 ГОД КАТАРГІ КОЖНЫ, 5— ДА 8 ГОД КАТАРГІ КОЖНЫ, адзін — ДА 5 ГОД КАТАРГІ, 4 — ДА 4-Х ГОД КАТАРГІ і двое да 3-х ГОД ТУРМЫ КОЖНЫ. Згодна паведамленьня друку, адзін з галоўных абвінавачаных ФЭДЭРЗЭН, якога называюць кіраўніком гамбурскага саюзу чырвоных франтавікоў і для якога пракурор таксама патрабаваў кары сьмерцю, мінулай ноччу НІБЫТА ПАКОНЧЫЎ У ТУРМЕ САМАГУБСТВАМ.

БЭРЛІНСКІ суд прыгаварыў сёньня 19-ГАДОВАГА РОЗЭНБЭРГА да аднаго году турмы за пашырэньне антыдзяржаўнай лятучкі. Тым-жа судом сёньня прыгаворан да 2 ГОД ТУРМЫ РАБОЧЫ ЛЕГЕНЭР па абвінавачаньні ў тым, што нібыта даў аднаму з сваіх знаёмых прачытаць брашуру, якая заклікае да барацьбы супроць ураду і да дзяржаўнай здрады.

У ТУРЫНГЕНЕ адбыўся працэс супроць 81 РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ, якія абвінавачваліся ў тым, што на наступны дзень пасьля прыходу нацыянал-сацыялістаў да ўлады (31 студзеня г. г.) арганізавалі ўсеагульную стачку на трох прадпрыемствах, якая суправаджалася «шматлікімі актамі». 54 З ІХ ПРЫГАВОРАНЫ Ў ВОГУЛЕ ДА 37 ГОД І 5 МЕСЯЦАЎ ТУРМЫ. Астатнія апраўданы.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

* Сёньня адбылася ў Гайдпарку 30-тысячная дэманстрацыя яўрэяў супроць праследваньня яўрэяў у Германіі. Усе яўрэйскія магазыны ў Лёндане былі закрыты. У момант прыбыцьця дэманстрацыі ў Гайдпарк да яе далучыліся калёны іншых дэманстрантаў і агульны лік удзельнікаў дэманстрацыі дайшоў да 50.000.

* 26-га ліпеня прыбывае ў Гдыню з афіцыяльным візытам латвійская ваенная эскадра пад камандаваньнем Спадэ, у складзе адной кананеркі, двух траўлераў, дзьвюх падводных лодак і двух гідраплянаў. Латвійская эскадра прабудзе ў Гдыні да 30 ліпеня.

* Згодна паведамленьняў з Капэнгагена, сацыял-дэмакратычны ўрад выдаў 12-га ліпеня уцёкшага з германскага канцлягеру палітэмігранта — рабочага Функе германскім уладам.

* Згодна паведамленьняў «Мінбао», вялікія паводкі і саранча амаль поўнасьцю зьнішчылі ўраджай у 250 раёнах уласна-Кітаю. Насельніцтва ў 100 млн. чалавек асуджана на голад.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Тавары—вёсцы

Да ўборачнай кампаніі мэнбаза Белгандлю адправіла ў раённую сетку на 50 тысяч рублёў тавараў для спабжэньня лепшых калгасьнікаў. Для гэтай мэты мэнбаза Белгандлю выпусьціла спэцыяльныя позвы, па якіх лепшыя калгасьнікі-ўдарнікі змогуць атрымаць тавары на адпаведную суму. Сярод тавараў ёсьць мануфактура, абутак, бялізна, галёшы, трыкатаж і інш. Апрача гэтага будуць наладжаны выезды з бліжэйшыя калгасы з вялікім асартымэнтам тавараў.

Пабудова новага хлебазаводу ў Менску

Улічваючы патрэбнасьць працоўных Менску ў дадатковай вытворчай базе для грамадзкага хлебапячэньня, Белкаапсаюз запраектаваў на 1934 год пабудову новага хлебазаводу магутнасьцю ў 150 тон у суткі. Прычым першая частка пабудовы з сутачнай магутнасьцю ў 100 тон павінна быць скончана ў чацьвертым квартале 1934 году (Белта).

Раённы зьлёт калгасьніц-ударніц

23-га ліпеня ў Сеньненскім раёне склікаецца зьлёт калгасьніц-ударніц, які ставіць сваёй мэтай мабілізаваць апошніх на ўборку збожжа і льну. На зьлёт запрошаны 40 перадавых аднаасобніц, якія добрасумленна выконваюць свае абавязкі перад дзяржавай. Падрыхтоўка да зьлёту праводзіцца пад лёзунгам заваяваньня першынства ў спаборніцтве з Лёзьнянскім, Шклоўскім і Полацкім раёнамі. (Белта).

Прэміі лепшым

Наркамфінам Саюзу адпушчана 40 тысяч руб. на паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў работнікаў нізавых фінорганаў БССР і прэміяваньне лепшых ударнікаў фінфронту за работу па выкананьні плянаў мабілізацыі сродкаў і плацяжоў з аграмаджанага сэктару ў першым паўгодзьдзі бягучага году.

Калегія НКФ БССР парашыла з гэтых сродкаў выдаць 3.000 руб. у распараджэньне прэзыдыуму ЦП саюзу фінбанкаўскіх работнікаў на паляпшэньне становішча дому адпачынку фінансава-крэдытных работнікаў, 10 тысяч руб.— на прэміяваньне лепшых ударнікаў фінфронту, радавых і адказных работнікаў з раённых, сельсавецкіх і цэнтральных апаратаў і друку і рэшту грошай пакінуць на прэміяваньне лепшых ударнікаў пасьля вынікаў выкананьня фінпляну за ліпень месяц.

За 6 месяцаў у Менску выплачана выйгрышаў па пазыках на 1.294 тыс. руб.

Ашчадкасамі г. Менску выплачана па аблігацыях дзяржпазык выйгрышаў у студзені месяцы на суму 122.695 руб., у лютым — на 223.381 руб, у сакавіку — 334.184 руб., у красавіку — на 191.504 руб., у маі — на 165.004 руб. і ў чэрвені — на 257.700 руб. Усяго — 1.294.465 руб.

Рост выплаты выйгрышаў, пачынаючы з лютага тлумачыцца тым, што ў лютым быў абвешчан дзень пазыкатрымальніка.

Палітэхнічнае абсталяваньне школы

За кароткі тэрмін свайго існаваньня Культпрамтрэст Наркамлёгпраму БССР дабіўся цэлага раду посьпехаў у сэнсе арганізацыі вырабу палітэхнічнага абсталяваньня, школьнай мэблі і канцылярскіх прылад.

Пры трэсьце налічваецца тры заводы: у Віцебску два заводы, якія вырабляюць дрэваапрацоўчы інструмант, сталярныя варштаты для школ, школьную мэблю і палітэхнічнае абсталяваньне і ў Барысаве адзін дрэваапрацоўчы завод, які вырабляе школьную мэблю і канцылярскія прылады.

За другі квартал заводамі Культпрамтрэсту выпушчана школьнай мэблі на суму 135 тыс. руб., канцылярскіх прылад — на суму 244 тыс. руб. і палітэхнічнага абсталяваньня на 200 тыс. руб.

У 1933 годзе трэстам намечана арганізаваць выраб палітэхнічнага абсталяваньня ў Барысаве і выраб спарт. інвэнтару для школ у Мазыры. Да пачатку навучальнага году, паводле пляну Культпрамтрэсту завод павінен выпусьціць 12 тыс. клясных сталоў з крэсламі, 1.000 дошак, 800 шафаў, канцылярскіх прылад на суму 770 тыс. руб. і рознага віду палітэхнічнага абсталяваньня на 1.500 тыс. руб.

Культ.-паліт. абслугоўваньне рабочых даршасбуду

Палітасьветны сэктар Наркамасьветы БССР заключыў дагавор з саюзам даршасбуду на культ.-паліт. абслугоўваньне рабочых дарожна-шасэйнага будаўніцтва.

Ужо арганізаваны ў раёнах: Менску, Магілеве, Віцебску, Слуцку, Полацку і Асіпавічах школы для няпісьменных і малапісьменных. Усяго мяркуецца арганізаваць 15 школ, якія ахопяць 450 чал. і 10 пунктаў групавога навучаньня з ахопам 800 чалавек.

Арганізавана таксама ў розных раёнах БССР, 14 бібліятэк, 18 вайсковых куткоў, якія абсталяваны неабходнымі рэчамі і амаль што ва ўсіх пунктах арганізаваны ленкуткі і абсталяваны радыё-ўстаноўкі. У бліжэйшы час намечана арганізаваць і пасылаць у раёны і кіно-перасоўкі.

Новыя кнігі

Гэтымі днямі выходзіць з друку наступная мастацкая літаратура: М. Чарот — 3-ці том твораў; У. Хадыка — «Праз жыцьцё прапетае» зборнік вершаў; Гурскі — «На крэсах усходніх»— п'еса; Лынькоў М. — «Саўка агіцірэйк» — апавяданьні. Анатоль Гідаш — «Вэнгрыя спраўляе ўрачыстасьць» — пераклад.

Друкуюцца і ў хуткім часе выйдуць новыя творы Маркса і Энгельса на беларускай мове: Маркс і Энгельс — «Адозва ЦК саюзу камуністаў», Энгельс — аб гістарычным матэрыялізьме, «Да гісторыі саюзу камуністаў», «Бруно Баўэр і ранейшае хрысьціянства», «Сялянская вайна ў Германіі», «Канспэкт 1-га тому «Капіталу».

Партвыдавецтва БССР выдае на беларускай мове 12-томнік твораў Леніна, падрыхтаваны і зданы ў друк 1, 6, 8, 9 і 11 тамы. Падрыхтоўваецца да друку поўны збор твораў У. І. Леніна. У гэтым годзе выйдуць з друку 1, 2, 3, 4 і 13 тамы, таксама выдаецца рад асноўных твораў Леніна, як зборнікі «Маркс, Энгельс, марксызм», «Пралетарская рэвалюцыя і рэнэгат Каўцкі» і інш. Падрыхтоўваецца да друку другое выданьне кнігі І. В. Сталіна «Пытаньні ленінізму».

Хроніка

* 31 ліпеня згодна рашэньня ЦКК-НК РСІ БССР склікаецца ўсебеларуская нарада загадчыкаў бюро скаргаў РСІ. На нарадзе будзе заслухан даклад аб формах і мэтадах работы бюро скаргаў, а таксама судаклады бюро скаргаў Асавейскай, Тураўскай і Віцебскай КК-РСІ.

* 3.500 дзіцячых пляцовак і дзіцячых садоў адкрыта на час касьбы і ўборкі ўраджаю ў калгасах і саўгасах БССР. З іх на круглы год застануцца працаваць 710 дзіцячых садоў пры торфазаводах, саўгасах і буйных калгасах. (Белта).

* 1-га верасьня гэтага году будзе скончана будаўніцтва аэрапорту ў Менску.

* Групай інжынэраў пры Цэнтральным доме тэхнікі знойдзена магчымасьць перавесьці напальныя печы для абпальваньня цэглы і вапны на тарфяное паліва і ў сувязі з гэтым зьмяніць дэфіцытныя чыгунныя каласьнікі глінянымі, зробленымі са звычайнай гліны без абпалу. Гэта замена дае 7. тыс. руб. эканоміі ў год на кожную напальную печку і апрача гэтага вялікую эканомію дроў і вострадэфіцытных чыгунных каласьнікоў. (Белта).

* Гэтымі днямі культпрамтрэстам Наркамлёгпраму БССР заключан дагавор з Культпраектам СССР аб пабудове ў Барысаве фабрыкі для загатоўкі паўфабрыкатаў для піяніна і ў Менску фабрыкі для іх зборкі.

Работа разьлічана так, каб ужо ў 1937 годзе выпусьціць 3 тыс. піяніна.

* Галоўнае кіраўніцтва культпрамтрэсту Наркамлёгпраму СССР пастанавіла арганізаваць у БССР выраб драўляных паўфабрыкатаў для фабрык муз. інструмантаў, якія знаходзяцца ў Ленінградзе і на Украіне.

* На дрэваапрацоўчым заводзе ў Барысаве закончана работа па арганізацыі вырабу гітар, паводле пляну культпрамтрэсту Наркамлёгпраму БССР завод павінен выпусьціць у 3 квартале 1933 году 10 тыс. гітар.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Менгарком КП(б)Б паведамляе, што партканфэрэнцыя па абутковa-гарбарнай прамысловасьці пераносіцца з 24 ліпеня г. г. на 29 ліпеня г. г., а 6-й гадзіне увечары у доме Камасьветы (уваход з вул. Карла Маркса).

Гарком прапануе выкарыстаць гэтыя дні для работы сэкцый па асобных галінах і выпрацоўкі канкрэтных мерапрыемстваў па кожным прадпрыемстве.

Менгарком КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 1 г. дня	Вялікі мастацкі замежны фільм У ІМЯ КАХАНЬНЯ
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ	Мастацкі фільм ДЗІЦЯ ДЗЯРЖЦЫРКУ
Пралетары	ПАТ і ПАТАШОН у камэдыі „Ахоўнікі парадку“
СПАРТАК Каса—з 3 г. 30 м.	Выдатны фільм Дзяўчына са скрынкай камэдыя ў 6 частках
Дзіцячы гукавы кіно-тэатр	Лепшы мастацкі прыгодніцкі фільм УЛАДАР СЬВЕТУ ў 7 частках.

МЕНСКІ аўтадарожны тэхнікум Галоўдартрансу БССР абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР

на першы курс дарожна-будаўнічай спэцыяльнасьці—120 асоб, з якіх 30 асоб на яўрэйскае аддзяленьне.
Усе паступаючыя трымаюць іспыты за курс 7-годкі па грамадазнаўстве, матэматыцы, фізыцы, хэміі і мове.
Узрост паступаючых у тэхнікум ад 16 да 30 год.
Прыём заяў да 20 жніўня г. г.
Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй, згодна пастановы СНК СССР, а іншагароднія і інтэрнатам.
Да заяў неабходна далучыць дакуманты (у арыгіналах): анкету; аб сацпахаджэньні і сацстановішчы паступаючага і яго бацькоў; узросьце; асьвеце; здароўі; дзьве засьведчаныя фотакарткі; марак на 40 кап. Пры запатрабаваньні анкеты—марак на 20 кап.
Тэхнікум дае годнасьць тэхніка па пабудове і эксплёатацыі аўта-гужавых дарог.
Аб прыёмовых іспытах будзе абвешчана дадаткова праз друк і асабіста па адрасе паступаючага.
Пачатак заняткаў з 1-IX г. г.
Дакуманты накіроўваць па адрасе: Менск, Савецкая, 18.
Дырэкцыя.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА.
23-га ліпеня ў 6 гадзін адбудзецца пашыранае пасяджэньне Аргкамітэту ССПБ і кіраўніцтва трэсту Белдзяржкіно.
На парадку дня—абгаварэньне тэматычнага пляну Белдзяржкіно на 1934 год.
Запрашаюцца пісьменьнікі, ударнікі заклікі ў літаратуру, рабкоры, работнікі газэт і ўсе жадаючыя.
Аргкамітэт ССПБ Белдзяржкіно.

Саюзны хэміка-тэхналёгічны тэхнікум хлебапячэньня ў г. Менску абвяшчае з 15-7 г.г. па 20-8 г.г. асеньні набор студэнтаў
на 1 курс тэхнікуму на аддзяленьні: тэхналёгічнае профіль (тэхніка-тэхналёга) і аддзяленьне эканамістаў-нармоўшчыкаў па працы (профіль тэхніка-эканаміста).
Тэрмін навучаньня 3 гады.
Да заяў прыкласьці наступныя дакуманты: аб адукацыі (арыгінал), завераную анкету, даведку аб здароўі, дакуманты аб сацыяльным паходжаньні і становішча паступаючага, дзьве фотакарткі, паштовых марак на 40 кап.
Іспыты па матэматыцы, фізыцы, хэміі і грамадазнаўстве з 20-8 па 25-8 г.г.
Стыпэндыяй і інтэрнатам студэнты забясьпечваюцца на агульных падставах.
Заявы падаваць: г. Менск БССР, Падгорны завулак, дом № 7, хэміка-тэхналёгічны тэхнікум.
Дырэкцыя тэхнікуму.

У сувязі з правядзеньнем усебеларускага зьлёту старшынь перадавых сельсаветаў
НАРАДА загадчыкаў АНА, дырэктароў ВНУ, тэхнікумаў і рабфакаў пераносіцца на 29-VII г. г.
Нарком Асьветы ЧАРНУШЭВІЧ.

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ „СОЮЗОРГУЧОТ“
прапануе ўсім б. слухачам курсаў навучальнага камбінату „Союзоргучот“, якія падпісаліся на аблігацыі пазыкі „Чацьвертага, завяршаючага году пяцігодкі“
атрымаць свае аблігацыі да 15-га жніўня г. г.
Пасьля ўказанага тэрміну аблігацыі будуць перададзены на захаваньне ў ашчадкасу № 16 у абязьлічаным выглядзе.
Навучальны камбінат „Союзоргучот“.

Менская гарадзкая партызанская камісія праводзіць ЗАЎТРА 24-VII—г. г.
штурмавы суботнік імя 2-й пяцігодкі
у саўгасе імя Крупскай (ехаць трамваем 2—4 на Старажоўку).
Яўка ўсіх чырвонагвардзейцаў і чырвоных партызан, пажадана з членамі сям'і, абавязкова роўна ў 7 гадз. раніцы. Збор у тупіку трамваю.
Камісія.

ПОЛЬСКІ ПЭДАГАГІЧНЫ ТЭХНІКУМ імя Бр. Вясялоўскага ў Менску абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР
на 1933-34 навучальны год на 1-ы і падрыхтоўчы курс. Скончыўшыя 7 гр. палітэхнічнай польскай школы або беларускай, якія ведаюць польскую мову, прымацуюцца на 1-ы курс. Скончыўшыя 6 груп—на 3-хмесячны падрыхтоўчы курс. На 1-ы курс і падрыхтоўчы прымацуюцца асобы не маладзей 15 год. Рабочыя, калгасьнікі і аднаасобнікі—беднякі атрымліваюць стыпэндыю і інтэрнат. Для паступленьня ў польпэдтэхнікум неабходны наступныя дакуманты: 1) даведка аб сацыяльным становішчы—калгасьнік ці аднаасобнік (абавязкова за подпісам старшыні с.-с.), даведка аб с.-г. падатку ў 1932-33 г. (адзначыць у выдачай даведцы—для польпэдтэхнікуму ў Менску); 2) пасьведчаньне аб асьвеце; 3) мэтрыка аб нараджэньні або пашпарт; 4) даведка аб стане здароў'я.
Польпэдтэхнікум зьвяртаецца з просьбай да школ, сельсаветаў, калгасаў, саўгасаў, партыйных і камсамольскіх ячэек аб правядзеньні адпаведнай вярбовачнай работы і накіроўваньні лепшых кандыдатаў на савецкіх настаўнікаў. Пачатак заняткаў з 1-га верасьня. Заявы і дакуманты будуць прымацца да 20-га жніўня. Кожны паступаючы пасьля падачы дакумантаў атрымлівае паведамленьне аб выніках прыему. Без паведамленьня аб прыняцьці паступаючы выяжджаць не павінен. Кожны паступаючы павінен мець сваю пасьцель, сяньнік і 30 руб. для харчаваньня на першы месяц да атрыманьня стыпэндыі. Заявы разам з дакумантамі (з указаньнем хатняга адрасу) належыць пасылаць па адрасу; Менск, Савецкая № 144, дырэктару польпэдтэхнікуму.
Дырэкцыя.

ДРУКАРНЯ „ЗЬВЯЗДЫ“ прымае вучняў у лінатыпны і стэрэатыпны цэхі.
Прымаюцца асобы, маючыя адукацыю самігодкі ва ўзросьце не менш 18 год.
Заявы з дакумантамі аб сац. палажэньні, узросьце, адукацыі і стане здароўя прымаюцца да 1-га жніўня, Савецкая, 63 другі паверх.
Вучні інтэрнатам не забясьпечваюцца.

Адкрыт асеньні прыём у бабруйскую аўта-манцёрную школу Дарбудвучу Галоўдартрансу БССР.
У школу прымаюцца асобы ва ўзросьце ад 16-ці да 19-ці год з асьветай не ніжэй 7-годкі.
Заявы прымаюцца да 20 жніўня г. г. у канцылярыі школы (гор. Бабруйск, рог вуліц Ленінскай і Кастрычніцкай). Да заяў прыкладаюцца наступныя дакуманты: 1) аб асьвеце, 2) сацпахаджэньні, 3) сацстановішчы, 4) узросьце, 5) стан здароўя.
Залічаныя ў школу атрымліваюць зарплату ад 32 руб. да 50 руб. і ўсе забясьпечваюцца інтэрнатам. На працягу вучобы зарплата прагрэсіўна павялічваецца ў залежнасьці ад пасьпяховасьці. Пры школе ёсьць сталоўка.
Тэрмін навучаньня ў школе 2 гады.
Пасьля сканчэньня школы вучні атрымліваюць спэцыяльнасьць аўтарэмманцёра з шафёрскім ухілам. Да дакумантаў абавязкова прыкласьці паштовых марак на 40 кап.
Адміністрацыя школы.

Беларускаму фота-геадэзычнаму тэхнікуму ПАТРЭБНЫ выкладчыкі
па наступных дысцыплінах:
ПА ГРАМАДАЗНАЎСТВЕ (гіст. УсеКП(б), палітэканомія, ленінізм) з месячным акладам 350 р.,
ПА ФІЗЫЦЫ з месячным акладам у 300 руб.,
ПА КАНТУРНА-КАМБІНАВАНАЙ ЗЬЁМЦЫ І ФОТАТАПАГРАФІІ з акладам па дагаворанасьці.
Кватэрай выкладчыкі будуць забясьпечаны.
Заявы накіроўваць да 10 жніўня па адрасе: г. Горкі, Беларускаму фота-геадэзычнаму тэхнікуму.
Дырэкцыя.

Партыйнае выдавецтва — Сэктар кнігагандлю ДВБ
Вышла з друку
РАЗАСЛАНА НА МЕСЦЫ І ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ:
ГІКАЛО Ш. Прамова на нарадзе сакратароў райкомаў і пам. нач. палітаддзелаў МТС па камсамольскай рабоце 14 чэрвеня 1933 году.
Стар. 24, тыр. 10.000, 1933 г., цана 10 кап.
ПАТРАБУЙЦЕ ва ўсіх кнігарнях і кіёсках ДВБ, БАКТ'у, РСС і Саюздруку.

Не чакайце апошніх дзён падпіскі
НА ГАЗЭТЫ:
„ЗЬВЯЗДА“ Орган ЦК і Мен. ГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР
„ОРКА“ (на польскай мове) Орган ЦК КП(б)Б
„РАУДОНАСІС АРТОЯС“ (на літоўскай мове) Орган ЦК КП(б)Б
НА ЧАСОПІСІ:
„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ“ Орган ЦК КП(б)Б
„БАЛЬШАВІЦКІ ДРУК“ Часопіс культпропу ЦК КП(б)Б
„Работніца і Калгасьніца БССР“ Выданьне ЦК КП(б)Б
ПАМЯТАЙЦЕ, ШТО СВАЯЧАСОВАЯ ЗДАЧА ПАДПІСКІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЛЕПШАЙ ГАРАНТЫЯЙ АКУРАТНАЙ ДАСТАЎКІ ГАЗЭТ І ЧАСОПІСАЎ.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: Менгарбюро Саюздруку (Ленінская 34, 2-гі паверх) з 9 г. раніцы да 9 г. веч. тыражнымі работнікамі Саюздруку, гарадзкімі і сельскімі лістаносцамі, якія маюць на гэта пасьведчаньне, усімі паштовымі агенцтвамі, а таксама ўсімі кіёскамі па продажы газэт.

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Адказны рэдактар—21-353; сакратарыят—21-354, сэктары: сельска-гаспадарчы і нац.-культурнага будаўніцтва—21-356; партсэктар—21-352; сэктары прамысловы, савецкага будаўніцтва і снабжэньня кааперацыі і нац. каап.—21-350; транспартны сэктар і бюро расьсьледаваньня—21-355; машыннае бюро—21-351; загадчык выдавецтва і аддзел абвестак—21-358; вучотна-тыражны сэктар—21-360; кантора выдав.—21-885; друкарня—21-357

Менск, друкарня «Зьвязды»

Галоўлітбел № 337.

Лінейная калібровочная мішэнь LRT-BE4-V2